

ЖЫЦЦЁ І ТРАГЕДЫЯ ПЕРШАГА ПРЭМ'ЕРА 5

ТАЯМНІЦЫ СТАРАДАЎНІХ ГАДЗІННІКАЎ 15




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЛІСТАПАДА 2018 г. СЕРАДА № 219 (28835)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей РУМАС, прэм'ер-міністр:**

*«У нядаўна прынятай праграме дзейнасці ўрада да 2020 года стварэнне спрыяльнага бізнес-асяроддзя разглядаецца як асноўны прыярытэт эканамічнай палітыкі. Відавочна, што празрыстае, прадказальнае і выгаднае заканадаўства, якое ствараецца і якое выключае прыняцце празмерных абцяжаранняў і новых бар'ераў, стане для бізнесу гарантам стабільнасці працы на нашым рынку. Прыемна, што нашы прадпрымальнікі аператыўна рэагуюць на выклікі і патрэбнасці рынку, генеруюць новыя ідэі і тым самым уносяць значны ўклад у падтрыманне стабільнасці беларускай эканомікі і стварэнне перадумоў для яе ўпэўненага росту».*

Вытокі малой радзімы

# НА РОДНЫМ БЕРАЗЕ



Гэтым разам у пошуках вытокаў малой радзімы «Звязда» накіравалася на Магілёўшчыну — у Круглянскі раён, на бераг ракі Друць, у вёску Цяцерын. Справа творчага жыцця работнікаў раённага Дома рамёстваў **Ларысы ЛЯМЦАВАЙ** і **Наталлі АНІКОВІЧ**, сфатаграфаваным на друцкім беразе, у нечым нагадвае выток, які прабіваецца з глыбінь стагоддзяў і дае сённяшнім жыхарам сапраўднае адчуванне сваіх каранёў, прыналежнасці да сваёй малой радзімы. Жанчыны першыя ў раёне пачалі папулярызаваць мясцовы традыцыйны строй і, па сутнасці, адрадзілі яго. Ларысе Лямцавай — метадысту, майстру па ткацтве традыцыйных паясоў, вырабе тэкстыльных лялек, народнаму майстру Беларусі — давялося звярнуцца да музеяў па дапамогу, зазірнуць у архіўныя крыніцы, па зернетку здабываць веды. А потым выкройваць і вышываць арнаменты і карункі. Наталля Аніковіч (на фота справа) — дырэктар Дома рамёстваў, калі заканчвала ўніверсітэт, выбрала для дыпломнай работы таксама рэканструкцыю жаночага строю свайго роднага рэгіёна. І цяпер, калі праходзяць фестывалі, святы і выстаўкі народных умельцаў, круглянскія майстрыхі абавязкова апранаюць свае новыя «старыя» строі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Аб'ём выхлапу вуглякіслага газу ($CO_2$) ва ўсім свеце ў 2017 годзе дасягнуў рэкорднага ўзроўню, павялічыўшыся на 1,6 %.

• **Запасаў адкрытых радовішчаў калійных соляў у Беларусі хопіць больш чым на 160 гадоў.**

• Банкаўскія карткі могуць не працаваць у Беларусі ноччу 17 лістапада.

• **Колькасць хворых на цукровы дыябет у Беларусі за 10 гадоў узрасла ў два разы.**



• Танцавальны марафон «Сур'ёзныя адносіны» ўпершыню пройдзе ў Мінску 17 лістапада.




# «БУРЖУЙКА» Ў ГАРАЖЫ




**Часта для жыхара шматпавярховага дома гараж — нешта большае, чым проста крытае месца для захоўвання і рамонту аўтамабіля. Дзе-нідзе іх пераабсталёўваюць пад склады, майстэрні ці нешта іншае. Але калі гэта робіцца цішком, то, як гаворыцца, збан носіць ваду да пары. Любая іскра, якая можа праскочыць з няспраўнай электраправодкі ці з падпольна падключанай печкі, — і вось ужо сям-там пачынаецца тленне. А калі гаражы аб'яднаны ў адзін масіў, то заўважыць, што недзе воддаль курыцца дымок, можна далёка не заўсёды. Асабліва цяжка гэта зрабіць зімой, калі светлавы дзень мінімальны па даўжыні. Менавіта таму супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях перыядычна наведваюцца ў гаражныя кааператывы з прафілактычнымі рэйдамі. У адзін з такіх выездаў адправіўся і карэспандэнт «Звязды».**

СТАР. 4

Класныя навіны

# Трансфармацыя адукацыі: поўнае паглыбленне... у лічбу

### Ці спросціць «Электронная школа» жыццё педагогам і як гэта адаб'ецца на якасці ведаў?

**У канцы мінулага года кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі». Як пабудаваць лічбавае грамадства? З чаго пачынаць? Якая роля ў гэтым працэсе адводзіцца школе? А можа быць, лічбавая трансфармацыя — проста модны трэнд ці часовая з'ява? Каб знайсці адказы на гэтыя пытанні, мы накіраваліся ў галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр (ГІАЦ) Міністэрства адукацыі...**

## Платформавы падыход



— ...І не мода, і не часовая з'ява, а працэс, у які трэба паглыбіцца як мага раней, каб атрымаць максімальную карысць, — запэўнівае **дырэктар ГІАЦ Павел ЛІС.** — Прычым хуткасць прыняцця рашэнняў у гэтай справе прынцыпова важная. Менавіта сістэма адукацыі з'яўляецца падмуркам для лічбавай эканомікі. Свет вакол нас кардынальна змяняецца, а свядомасць людзей, на жаль, не заўсёды паспявае за зменамі. Сёння патрабуецца, каб сістэма адукацыі не проста рыхтавала кадры для інавацыйнай эканомікі, але і прагназавала змяненне кваліфікацыйных рамак, з'яўленне новых прафесій, была больш гнуткай. Не даганяла, а апераджала...

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

# НА НОВЫМ РАБОЧЫМ МЕСЦЫ

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка назначыў чатырох паслоў і ўзгадніў кіраўнікоў прадпрыемстваў і выканкамаў**

**Кіраўнік дзяржавы назначыў:**

ПАНАМАРОВА Аляксандра Леанідавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Венгрыі і па сумяшчальніцтве ў Босніі і Герцагавіне;

СЛУКУ Юрыя Алегавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы і па сумяшчальніцтве ў Іарданскім Хашыміцкім Каралеўстве і Ліванскай Рэспубліцы;

РЖАВУСКАГА Андрэя Іосіфавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Індыя і па сумяшчальніцтве ў Дэмакратычнай Сацыялістычнай Рэспубліцы Шры-Ланка;

СЯМАШКУ Уладзіміра Ільіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі і па сумяшчальніцтве паўнамоцным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Эканамічным савеце СНД і пры АДКБ, спецыяльным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь па пытаннях інтэграцыйнага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС, СНД, АДКБ;

ДАБРЭГУ Кірыла Віктаравіча — намеснікам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

РАБКАЎЦА Івана Рыгоравіча — старшынёй Пінскага гарвыканкама;

БЫКАВА Алега Пятровіча — старшынёй Шумілінскага райвыканкама;

САЛАЎЯ Генадзя Міхайлавіча — першым намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

БАРАНОЎСКАГА Андрэя Анатольевіча — старшынёй Акцябрскага райвыканкама;

ДЗЕРКАЧОВА Юрыя Мікалаевіча — старшынёй Чачэрскага райвыканкама;

КАРОЦІНА Мікалая Мікалаевіча — першым намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама;

НАЎНЫКІ Валерыя Мікалаевіча — рэктарам установы адукацыі «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт»;

ШАГІДЗЕВІЧА Арцёма Артуравіча — рэктарам установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі»;

ДРАЗДА Паўла Уладзіміравіча — генеральным дырэктарам дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга»;

ЛАЗАРЭВІЧ Надзеі Анатольеўны — генеральным дырэктарам ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Бабруйскаграмаш»;

КАРЧЭЎСКАЙ Наталлі Уладзіміраўны — першым намеснікам міністра культуры;

ШАРАМЕЦЬЕВА Сяргея Іванавіча — намеснікам міністра культуры;

ШАТРАЎКІ Валянціна Генадзьевіча — першым намеснікам міністра лясной гаспадаркі;

КРЭЧА Уладзіміра Іванавіча — намеснікам міністра лясной гаспадаркі;

СЕЛІВЕРСТАВА Юрыя Міхайлавіча — першым намеснікам міністра фінансаў;

БЕЛКАЎЦА Андрэя Міхайлавіча — намеснікам міністра фінансаў;

ЧАРВЯКОВА Аляксандра Віктаравіча — першым намеснікам міністра эканомікі;

ЯРАШЭВІЧА Дзмітрыя Віктаравіча — намеснікам міністра эканомікі;

РАЯНТОВІЧА Сяргея Віктаравіча — намеснікам міністра энергетыкі;

ВАСІЛЬЕВА Аляксандра Паўлавіча — членам Гомельскага аблвыканкама.

## ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ НАРОДУ

Падчас сустрэчы з назначанымі кіраўнікамі мясцовай вертыкалі Прэзідэнт заўважыў: «Вы павінны прымаць рашэнні і несці за гэтыя рашэнні адказнасць. У нас пачынаецца палітычная «вакханалія», якая працягнецца мінімум паўтара года. І выбары парламента, і выбары Прэзідэнта потым, ці як мы вырашым, як праводзіць нам гэтыя палітычныя кампаніі. Нам трэба ва ўласцівай манеры прайсці гэты этап, не скінуўшы абароты. Народ нам гэта не даруе. Вы ведаеце, што палітычная кампанія — гэта экзамен, таму нам прыйдзецца здаваць адзін і другі экзамен і даваць справаздачу народу».

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «барацьба з карупцыяй — гэта непахіснае маё патрабаванне і мае дзеянні з першага дня прэзідэнцтва». Таксама ён звярнуў увагу: «Якія б ні былі беларусы — лепш за нашых людзей няма. Гэта нераспешчаныя, цярплівыя людзі, якія ўмеюць працаваць. Адпаведна і мы павінны дзейнічаць, і мы павінны адпавядаць свайму народу», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

## ГЛАБАЛЬНЫЯ ІНТАРЭСЫ І МАГЧЫМАСЦІ

На сустрэчы з пасламі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў яшчэ раз паглядзець на паўнамоцтвы нашага прадстаўніка ў Расіі, каб ён мог больш эфектыўна вырашаць двухбаковыя пытанні. «Ён павінен валодаць надзвычайнымі паўнамоцтвамі, у яго павінен быць прамы доступ да Прэзідэнта ў любы час па тых пытаннях, якія датычацца нашых адносін з Расійскай Федэрацыяй», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Уладзімір Сямашка плануе ў найбліжэйшы час падвесці вынікі і ўнесці пэўныя прапановы, што трэба для таго, каб у поўным аб'ёме выконваць абавязкі.

На сустрэчы з журналістамі Уладзімір Сямашка адзначыў, што Расія застаецца асноўным эканамічным партнёрам Беларусі. «У нас ні з адной краінай такога тавараабароту няма, як з Расіяй. Сёлета, магчыма, будзе каля 35 мільярдаў долараў, — падзяліўся прагнозам дыпламат. — Тэмп росту тавараабароту паміж дзвюма краінамі сёлета ацэньваецца ў 16 %, але расце больш не экспарт, а імпарт. Гэта ў тым ліку звязана з цаной на нафту, праблемамі пастаўкі прадукцыі харчавання і гэтак далей». Адмоўнае сальда з Расіяй і, як вынік, — знешняга гандлю ў цэлым — гэта галоўная эканамічная праблема, на думку Уладзіміра Сямашкі.

Што датычыцца Сірыі, кіраўнік дзяржавы выказаў меркаванне, што рэальныя падзеі ў гэтай краіне часам перабольшваюць: «Я атрымліваю інфармацыю не толькі са СМІ. Думаю, што там можна працаваць, і ўмовы там для пасла не горшыя, чым у іншых краінах». Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў добрыя адносіны з сірыйскім Прэзідэнтам Башарам Асадам, з краінай у цэлым.

Звяртаючыся да новага пасла ў Індыі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Адпачываць не прыйдзецца: краіна такая, што нам трэба наладжваць з ёй больш цесныя адносіны. На ўзроўні высокім палітычныя кантакты ў нас добрыя, але гандлёва-эканамічны ўзровень супрацоўніцтва абсалютна не адпавядае нашым жаданням». Прэзідэнт заўважыў, што шмат ідзе абмеркаванняў, а трэба больш актыўна рухацца.

У выніку кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўсе назначэнні паслоў вельмі важныя: тут ёсць і глабальныя інтарэсы, і магчымасці.

## РАБІЦЬ ДЗЕЛЯ ЭФЕКТУ

Аляксандр Лукашэнка падрабязней паразмаўляў з назначанымі кіраўнікамі прамысловых кампаній. Павел Дрозд прапанаваў рэформу «Белэнерга». Прэзідэнт падкрэсліў: «Калі мы ідзём на нейкую рэформу, мы павінны бачыць мэту і рабіць гэта не дзеля рэформы, а дзеля эфекту». Гаворачы пра «Бабруйскаграмаш», кіраўнік дзяржавы загадаў усе пытанні ўзяць на катроль. Надзея Лазарэвіч, генеральны дырэктар кіруючай кампаніі холдынга «Бабруйскаграмаш», заўпэўніла, што ведае прадукцыю, з якой будзе працаваць, і праблемы, з якімі сутыкаецца вытворчасць. Пасля сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам яна адзначыла: «Прэзідэнт паставіў задачы нарасціць аб'ёмы вытворчасці, знайсці новыя рынкі збыту, скараціць выдаткі і сабекошт, а таксама аб'яднаць усе шэсць заводаў холдынга «Бабруйскаграмаш» у адзінае цэлае, кансалідаваць пытанні закупак». Надзея Лазарэвіч падкрэсліла, што неабходна заняцца імпартазамяшчэннем і «паказаць новы твар прамысловасці».

Рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі стаў Арцём Шагідзевіч. «Кіраўніком дзяржавы вызначаны ўсе асноўныя задачы па развіцці вышэйшых устаноў адукацыі на Рэспубліканскім педагагічным савеце. І сёння Прэзідэнт падкрэсліў, што мы павінны цесна супрацоўнічаць з заказчыкамі кадраў, у прыватнасці для Акадэміі авіяцыі — гэта Нацыянальны аэрапорт «Мінск», «Белавія», «Белавіянавігацыя». Мы павінны чуць спажыўцоў і рыхтаваць тыя кадры, якія неабходны для іх. Плюс экспарт адукацыйных паслуг», — звярнуў увагу Арцём Шагідзевіч. — Акрамя таго, наша ВНУ адзіная ў краіне, што рыхтуе, напрыклад, інжынераў па абслугоўванні беспілотнікаў і кіраванні імі».

**Надзея АНІСОВІЧ.**

# Чым цікавы нам бераг турэцкі?

## Патэнцыял адносін Беларусі і Турцыі выкарыстоўваецца не да канца

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі Бінал Йылдырымам.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы расказаў, што сочыць за сітуацыяй у Турцыі і рэгіёне. «Нам вельмі імпануе ваша незалежная палітыка, пазіцыя, якую вы займаеце па глабальных пытаннях развіцця нашай планеты, і ў гэтым плане, шчыра кажучы, вы шмат чаго дабіліся. Што датычыцца нашых адносін, то яны развіваюцца ня998дрэнна, хоць хацелася б, каб лепей, але той мільярд тавараабароту, які мы будзем мець сёлета, — прыкладна мільярд, а магчыма, і перасягнем яго, — добрае дасягненне нашых краін», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на тое, што ў гандлёва-эканамічных адносінах ёсць некаторыя праблемныя моманты, але, магчыма, яны будуць вырашаны падчас перагавораў з Міхаілам Мясніковічам, старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. Паміж нашай краінай і Турцыяй дзейнічае больш за 20 міжнародных дагавораў і пагадненняў, а таксама створана сумесная міжурадавая эканамічная камісія. Дарэчы, за дзевяць месяцаў гэтага года тавараабарот паміж дзвюма краінамі склаў 755,6 мільёна долараў (113 % да аналагічнага перыяду 2017-га), прычым экспарт павялічыўся на палову і склаў 151,2 мільёна долараў. На пачатак года ў нашай краіне было зарэгістравана больш за 300 прадпрыемстваў з турэцкім капіталам.

Бінал Йылдырым пасля размовы з Прэзідэнтам пракаментаваў журналістам асноўныя пазіцыі. Ён нагадаў, што па выніках мінулых візітаў дасягнута шмат станоўчага. Старшыня турэцкага парламента расказаў пра развіццё турыстычнай сферы: 240 тысяч беларусаў летась адпачылі ў Турцыі. Па яго словах, з'явілася неабходнасць павялічыць узаемныя авіярэйсы, аб чым таксама ішла размова з кіраўніком дзяржавы. Асобна Бінал Йылдырым адзначыў падтрымку Беларусі ў барацьбе з тэрарызмам.

* * *

Афіцыйныя сустрэчы з турэцкай дэлегацыяй працягнуліся і на парламенцкім узроўні. У Савеце Рэспублікі калег віталі спікеры верхняй і ніжняй палат Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч і Уладзімір Андрэйчанка.

— Парламенты адыгрываюць і будуць адыгрываць у далейшым вельмі значную ролю ў развіцці нашага супрацоўніцтва. І хачу вас інфармаваць, што наш Нацыянальны сход ратыфікаваў зусім нядаўна (некалькі месяцаў таму) два вельмі важныя пагадненні — аб узаемным садзейнічанні і абароне інвестыцый і другое, што датычыцца міжнародных камбінаваных перавозак, — звярнуўся Міхаіл Мясніковіч да кіраўніка дэлегацыі, старшыні Вялікага нацыянальнага сходу Турцыі Бінала Йылдырыма.

Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва курыруе пытанні развіцця раёнаў, таму асаблівая ўвага, як звычайна, удзяляецца міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву. Міхаіл Мясніковіч выказаў надзею, што міжпарламенцкая група дружбы дзвюх краін будзе займацца гэтым вектарам партнёрства.

У прыярытэце таксама ўзаемадзеянне ў транспартна-лагістычнай (у тым ліку з удзелам трэціх краін) і банкаўскай сферах. Парламент будзе садзейнічаць з'яўленню ў Беларусі першага турэцкага банка.

Уладзімір Андрэйчанка ў сваю чаргу прапанаваў групе дружбы заняцца распрацоўкай дарожнай карты супрацоўніцтва парламентаў.

— Думаю, важна было б у гэтай дарожнай карце ўдзяліць сур'ёзную ўвагу пытанням навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, пытанням у сферы адукацыі, — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Перагаворы на вышэйшым і парламенцкім узроўні асабліва актуальныя з нагоды візіту Прэзідэнта Беларусі ў Турцыю. Ён запланаваны ў першай палове будучага года.

**Надзея АНІСОВІЧ, Марыя ДАДАЛКА.**

# Наладка для бізнесу

**Сусветны тыдзень прадпрымальніцтва дзяржава разглядае як пляцоўку для правядзення дыялогу паміж уладай і бізнес-супольнасцю, адзначае прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС.**

Ён паведаміў, што ў 2018 годзе было прынята больш за тры тысячы заявак аб пачатку прадпрымальніцкай дзейнасці, амаль на дзве тысячы чалавек павялічылася ў краіне колькасць рамеснікаў.

Прэм'ер-міністр таксама падкрэсліў, што важна ўказаць моладзі на лібералізацыю заканадаўства ў краіне і стварыць спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі бізнес-ідэй. «Ад таго, наколькі новае пакаленне авалодае прадпрымальніцкай культурай, зможа рэалізаваць свой творчы патэнцыял, залежыць не толькі іх уласная будучыня, але і будучыня нашай краіны», — сказаў Сяргей Румас.

Дарэчы, сёння ў рамках Тыдня працуе секцыя маладзёжных праектаў і стартапаў.

На Міжнародным форуме прадпрымальніцтва, які прайшоў у рамках Тыдня ў аўторак, міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ звярнуў увагу, што Дырэктывай № 4 («Аб развіцці прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляванні дзелавой актыўнасці ў Рэспубліцы Беларусь») урад задаў стратэгію па падтрымцы малога і сярэдняга бізнесу.

«Мне вельмі падабаецца, што дэманструюцца не толькі дасягненні ў гэтым сегменце эканомікі, але і паказваюцца праблемы, у тым ліку ў рэгіёнах, — выказаўся пра ўбачанае на форуме міністр. — На сённяшні дзень адна з нашых асноўных праграм — прапаноўваць больш рэлевантныя рашэнні для бізнесу».

Беларусь ужо восьмы раз, пачынаючы з 2011 года, далучаецца да ініцыятывы правядзення спецыяльнага Тыдня для малога і сярэдняга бізнесу. Глабальны рух аб'ядноўвае 170 краін, каб знайсці інавацыйныя рашэнні для прадпрымальніцтва. У праграме Тыдня — выстаўкі, форумы, круглыя сталы і канферэнцыі на актуальныя тэмы.

**Ганна ЮНЧЫЦ.**

Грошы

# ХТО НЕ ПРАЦУЕ, ТОЙ БУДЗЕ ПЛАЦІЦЬ ЗА «КАМУНАЛКУ» ЦАЛКАМ

**Спецыялісты ЖКГ паведамілі, як будуць у наступным годзе аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі тыя працаздольныя грамадзяне, якія не працуюць.**

У Беларусі з 1 студзеня наступнага года тым, хто будзе ў спісах не занятых у эканоміцы, прыйдзецца аплачваць гарачае водазабеспячэнне па эканамічна абгрунтаваных тарыфах, а з 1 кастрычніка 2019 года — цеплазабеспячэнне жылых памяшканняў. Гэта датычыцца і цэнтралізаванага цеплазабеспячэння, і падачы цяпла з дапамогай індывідуальных газавых катлоў.

«Налічэнне платы за жыллёва-камунальныя паслугі робіцца ў адносінах да плацельшчыкаў. Гэта могуць быць уласнікі жылых памяшканняў, наймальнікі камерцыйнага, сацыяльнага жылля, грамадзяне, якія заключылі дагавор найму жылога памяшкання прыватнага жыллёвага фонду. Калі не заняты ў эканоміцы жыве адзін, то за названыя паслугі заплаціць у поўным аб'ёме; калі ён пражывае з членамі сям'і, то будзе плаціць прапарцыйна той колькасці паслуг, якія былі аказаны менавіта яму», — растлумачылі ў Міністэрстве ЖКГ.

Калі ў кватэры жывуць два не занятыя ў эканоміцы чалавекі, то яны абодва будуць плаціць па поўных тарыфах. Калі ж плацельшчыкам ЖКП з'яўляецца заняты ў эканоміцы ці пенсіянер, а з ім жывуць працаздольныя людзі, не занятыя ў эканоміцы, то налічваць плату за жыллёва-камунальныя паслугі будуць у агульнапрынятым парадку.

Інфармацыя пра спажытыя паслугі гарачага водазабеспячэння і ацяплення па тарыфах, якія субсідуюцца, і эканамічна абгрунтаваных тарыфах будзе размешчана ў паведамленнях на аплату жыллёва-камунальных паслуг.

У той жа час раней у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны вызначылі, у якіх выпадках не занятыя ў эканоміцы грамадзяне не будуць аплачваць 100 % за ЖКП. Выключэнне будуць складаць грамадзяне, якія маюць пытанні са здароўем, даглядаюць дзяцей старэйшых за 7 гадоў або недзеяздольных грамадзян, а таксама тыя, хто не можа знайсці працу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Як нас дураць

## Рабочы з Дзятлава стаў ахвярай інтэрнэт-ашуканцаў

**Як паведамілі ў Следчым камітэце, 41-гадовы жыхар горада Дзятлава звярнуўся з заявай, у якой растлумачыў, што ўбачыў у інтэрнэце сайт кампаніі Quantum System, якая прапаноўвала заробак на правядзенні здзелак з фіксаваным прыбыткам і прыцягненнем сваіх аналітыкаў. Пасля прагляду прэзентацыйнага роліка кампаніі, якая гарантавала высокія прыбыткі пры мінімальных укладаннях грашовых сродкаў, мужчына пачаў супрацоўнічаць з ёй.**

Ён зарэгістраваўся на сайце і выконваў усе ўказанні куратара. Пры гэтым пералічваў у Расійскую Федэрацыю замежную валюту, паколькі меркаваў, што яго грошы ідуць на здзелкі з каштоўнымі паперамі і металамі. Усяго ён пералічыў 3 тысячы долараў ЗША.



Калі мужчына паспрабаваў вывесці свае сродкі з абароту разам з абяцанымі працэнтамі, работнік кампаніі Quantum System па тэлефоне запатрабаваў пералічыць за гэта 1 тысячу долараў ЗША. Пасля адмовы выканаць патрабаванне ён перастаў выходзіць на сувязь.

Дзятлаўскім раённым аддзелам СК распачата крымінальная справа па факце завалодання маёмасцю шляхам падману з выкарыстаннем інтэрнэту (ч. 1 арт. 209 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь).

Следчыя ўстанавілі, што пацярпелы пералічваў свае грошы ў Расію на адрасы розных фізічных асоб. Дарэчы, у сеціве ёсць інфармацыя аб тым, што Quantum System з'яўляецца ашуканскім праектам і яго ахвярамі сталі грамадзяне з многіх краін. «Мільянер», які здымаўся ў прэзентацыйным роліку, на самай справе з'яўляецца малавядомым акцёрам. Нягледзячы на ўсё гэта, колькасць ахвяр падману павялічваецца.

Улічваючы ўсё гэта, следчыя настойліва рэкамендуюць грамадзянам не ажыццяўляць спробы зарабіць грошай пры дапамозе сумнеўных інтэрнэт-рэсурсаў.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Дэмакраты склалі 85 пытанняў, рыхтуючыся да расследаванняў дзейнасці Трампа

Члены Дэмакратычнай партыі ЗША маюць намер «знайсці адказы» на 85 пытанняў, сфармуляваных у рамках шэрагу расследаванняў, якія яны плануюць пачаць у дачыненні да Дональда Трампа. Гэтыя пытанні дапамогуць даць прававую ацэнку дзеянням Трампа на пасадзе прэзідэнта ЗША, а таксама дзеянням яго адміністрацыі. Пра гэта паведаміў у панядзелак партал Axios, супрацоўнікі якога пагутарылі з членамі Дэмакратычнай партыі, якая атрымала большасць у Палаце прадстаўнікоў Кангрэса ЗША па выніках праведзеных на мінулым тыдні прамежкавых выбараў.

Дэмакраты, у прыватнасці, збіраюцца разабрацца ў тым, чаму Трамп не пажадаў публікаваць сваю падатковую дэкларацыю, прааналізаваць скандалы з яго ўдзелам, іміграцыйную палітыку, адносіны амерыканскага лідара з Расіяй і яе прэзідэнтам Уладзімірам Пуціным, рашэнне прэзідэнта адправіць у адстаўку міністра юстыцыі Джэфа Сешнса, удзел членаў сям'і Трампа ў прыняцці ім палітычных рашэнняў, а таксама яго абразлівае і пагардлівае стаўленне да амерыканскіх СМІ.

Яшчэ адно расследаванне пачнецца ў сувязі з інфармацыяй, якая нядаўна з'явілася, аб асабістым удзеле Трампа ў здзяйсненні грашовых выплат былой порнаактрысе Стэфані Кліфард і былой фотамадэлі часопіса Playboy Карэн Макдугал у абмен на іх маўчанне аб нібыта наяўных інтымных сувязях з ім.

## Прэзідэнт Афганістана лічыць магчымым мірнае пагадненне з талібамі

Прэзідэнт Афганістана Ашраф Гані заявіў, што разлічвае заключыць мірнае пагадненне з радыкальным рухам «Талібан». Пра гэта, як паведамляе ў аўторак агенцтва Anadolu, ён сказаў падчас відэаканферэнцыі са студэнтамі вашынгтонскага ўніверсітэта Джонса Хопкінса.

«Пытанне не ў тым, ці будзе гэта (мір з талібамі). Пытанне, на мой погляд, у тым, калі гэта адбудзецца.



У XXI стагоддзі ўжо цяжка заканчваць войны ваеннымі метадамі. Супрацьстаянне Афганістана і «Талібана» будзе вырашана палітычным шляхам», — сказаў ён.

Прэзідэнт указаў, што «Талібан» цяпер «не знаходзіцца ў выйгрышнай пазіцыі». Гані адзначыў, што «паміж ЗША і афганскім урадам існуюць канкрэтныя дамоўленасці адносна прасоўвання мірнага працэсу».

Прэзідэнт Афганістана звярнуўся да Пакістана з заклікам выбудоўваць мірныя адносіны. «Мы прапануем Пакістану мір, каб пакласці канец гэтай неаб'яўленай варожасці. Калі гэтага не адбудзецца, пачнецца ўзаемны недавер, сацыяльная і культурная варожасць паміж нашымі народамі», — сказаў ён.

## У Сыктыўкары судзяць мясцовага жыхара, які абвінавачваецца ў пашкоджанні помніка рублю

У Сыктыўкары перададзена ў суд крымінальная справа ў дачыненні да 22-гадовага мясцовага жыхара, які абвінавачваецца ў пашкоджанні помніка «Знак рубля» ў скверы на Стэфанаўскай плошчы горада, паведамляе «Інтэрфакс».

27 красавіка гэтага года нецвярозы малады чалавек праходзіў праз сквер. Спыніўшыся каля «Знака рубля», устаноўленага непадалёк ад аддзялення Нацыянальнага банка па Рэспубліцы Комі ў 2015 годзе, сыктыўкарац «зведаў вострае пачуццё сацыяльнай несправядлівасці, абумоўленае ўласным цяжкім фінансавым становішчам», сказана ў матэрыялах крымінальнай справы.

«З гэтай прычыны ён нанёс па малой архітэктурнай форме два ўдары нагой, ад чаго тая ўпала і разбілася», — адзначаецца ў паведамленні на сайце пракуратуры Рэспублікі Комі.

Шкода ад акта вандалізму склала 303 тысячы расійскіх рублёў.

# СВЕТЛАЯ ПАМЯЦЬ, МАЭСТРА

**Народны артыст Беларусі і СССР, выпускнік трох кансерваторый, нязменны кіраўнік Беларускага саюза кампазітараў, аўтар мноства песень, якія любяць некалькі пакаленняў слухачоў, — песні Ігара Лучанка пазнаюць з першых акордаў і нават часта лічаць народнымі. 2 лістапада кампазітар быў шпіталізаваны з інсультам, пасля якога знаходзіўся ў медыкаментознай коме. Урачы сталічнай бальніцы хуткай дапамогі рабілі ўсё магчымае, але... 12 лістапада Ігара Міхайлавіча не стала, — і гэта непапраўная страта не толькі для родных і блізкіх, кампазітараў і паэтаў, артыстаў, музыкантаў, не толькі для беларускай музыкі, але для нашай культуры наогул.**



Фота БелТА.

**Народны артыст Беларусі, кіраўнік ансамбля «Сябры» Анатоль ЯРМОЛЕНКА** заўжды падтрымліваў сяброўскія стасункі з кампазітарам, нават запрашаў Ігара Міхайлавіча на юбілейны канцэрт 31 кастрычніка, аднак той не змог прыйсці, бо дрэнна сябе адчуваў: «Былі яго жонка і сын Андрэй, я прадставіў іх слухачам і сказаў, што песні Ігара Міхайлавіча заўжды будуць у нашым рэпертуары. І ўсяго праз некалькі дзён даведаўся пра тое, што ў яго здарыўся інсульт. На маю думку, гэта такая вялізная страта, памер якой зараз папросту цяжка ацаніць... Шчыры смутак у нашых сэрцах і вечная памяць Ігару Міхайлавічу Лучанку...»

«Калі сыходзяць такія людзі, звычайна гавораць, што сышла эпоха. Адзінае, што можа ўтрымаць яе, працягнуць яе гучанне, — гэта памяць сэрца, — напісала ў сацыяльных сетках **спявачка Настасся ЦІХАНОВІЧ**. — І вельмі хочацца зберагчы гэту памяць, каб усё тое важнае, цудоўнае, глыбокае і шмат у чым гаючае мастацтва такіх нешматлікіх не па званні, а па нашым прызнанні, сапраўды вялікіх і народных беларускіх творцаў працягвала гучаць і заўжды было актуальным, бо часта гэта — старонкі нашага жыцця, нашы пачуцці, нашы ўспаміны, асабістая гісторыя, якую суправаджаюць гукі любімых мелодый...»

Імя Ігара Лучанка шмат гадоў непарыўна звязана з творчасцю «Песняроў». **Мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» Раман КОЗЫРАЎ** зазначае, што музыканты вельмі блізка да сэрца прынялі сумную навіну, якая сустрэла іх на радзіме: «Мы літаральна толькі вярнуліся з гастроляў па Расійскай Федэрацыі, выступалі ў тым ліку па Поўначы, і ўсе гэтыя канцэрты пачыналі з тэмы сёлетняга юбілею Ігара Міхайлавіча, шмат расказвалі пра яго, спявалі яго песні. Іх, дарэчы, расійскія слухачы добра помняць і любяць — калі мы пачыналі іграць «Алесю», «Зачараваную», «Мой родны кут», іх вельмі цёпла прымалі і падпявалі. А днямі, калі «Песняры» выступалі ў тым ліку з песнямі Ігара Лучанка ў пасольстве Беларусі ў Маскве, вялікая зала была набітая бітком, і людзі нават пры высокіх чынах і званнях сядзелі на прыступках, каб паслухаць гэты канцэрт... Апошні раз мы з Ігарам Міхайлавічам бачыліся на ягоным юбілейным вечары ў філармоніі, і я тады адзначыў для сябе: яго песні добра ведае і сучасная моладзь, а значыць, яны будуць жыць і гучаць надалей — і гэта, магчыма, самае важнае для кожнага творцы, ведаць, што твая спадчына застанецца. Прынамсі, наш калектыў зробіць для гэтага ўсё магчымае».

**«Звязда», таксама як і калегі па творчым цэху, выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім Ігара Міхайлавіча Лучанка. Развітанне з кампазітарам пройдзе 14 лістапада ў Цэнтральным Доме афіцэраў.**

* * *

**Спачуванне ў сувязі са смерцю народнага артыста СССР Ігара Лучанка яго родным, блізкім і калегам накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю старшыні грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кампазітараў» народнага артыста СССР ЛУЧАНКА Ігара Міхайлавіча і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Ігара Міхайлавіча ЛУЧАНКА, беларускага кампазітара, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, народнага артыста Беларусі і СССР, прафесара, і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім.**

# «БУРЖУЙКА» Ў ГАРАЖЫ

## ДРОВЫ І «ШЭРЫЯ» МАЙСТЭРНІ

...Позняя восень на цяпло не вельмі шчодрая. І калі раніцай слупок тэрмометра знаходзіцца каля нулявой адзнакі, то круці не круці, а чымсьці ў гаражы абагравацца трэба, калі там нехта знаходзіцца даволі доўгі час. Нормы пажарнай бяспекі дазваляюць гэта толькі для электрычнага радыятара. Але прыборы гэтыя, як вядома, даволі-такі пражэрлівыя. А 1 кілават-гадзіна для гаража каштуе амаль 19 капеек — па эканамічна абгрунтаваным тарыфе. Вось і ідуць уладальнікі і арандатары гаражоў на хітрыкі, каб сэканоміць грошы. Як правіла, у ролі ацяпляльніка яны выкарыстоўваюць класічную печку-«буржуйку». Дымаход з яе падключаецца да агульнай сістэмы вентыляцыі. І так над гаражамі пачынае курыцца дымок...



— Гэта яшчэ паўбяды, калі мы натыкаемся на звычайную «буржуйку», — заўважае **старшы інспектар інспекцыі нагляду і прафілактыкі Фрунзенскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях горада Мінска Мікалай ТУРАВЕЦ.** — Зараз у моду ўваходзяць самаробныя печкі, якія працуюць на адпрацаваным маторным масле. На першы погляд, гэта вельмі зручна. Выдаткі на эксплуатацыю «буржуек» мінімальныя, ну а адпрацаванае масла можна з лёгкасцю знайсці ў любым гаражным масіве. Небяспека такіх печак у тым, што яны часта зроблены не ў заводскім цэху, таму не прайшлі ніякіх выпрабаванняў. Яны могуць выбухнуць ці атруціць гаспадара пры няспраўнасці ў гаражы вентыляцыйнай сістэмы.

І вось над адным з гаражоў весела курыцца дымок. «Запеленгаваць» яго вельмі проста — калі на вуліцы ўсяго адзін градус цяпла, то парушальнік выдасць сам сябе.

Стукаемся ў дзверы гаража. Адтуль выходзіць мужчына гадоў сарака.

— Ага, вось тое, аб чым я і думаў, — кажа Мікалай Туравец. — У кутку гаража прытулілася печка, якую так лёгка і не заўважыш. Чаму парушаеце?

— Дык дорага электрычнасцю атапляць! А дровы танныя. А ў чым праблема, уласна кажучы? Печка ж заводская, вы паглядзіце.

— Праблема ў тым, што карыстацца імі нельга з-за таго, што яны пажаранебяспечныя. Вось выскачыць іскра — і што вы рабіць будзеце?

— Дык у мяне вогнетушыцель ёсць.

— А пакажыце яго, дарэчы.

Мужчына ідзе ў іншы кут гаража і дастае адтуль вогнетушыцель. Усё б нічога, але ён аказаўся пратэрмінаваны ажно на пяць гадоў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Небяспека пажару ў гаражы ў тым, што агонь даволі хутка распаўсюджваецца па суседніх пабудовах, а вось заўважыць дымок адразу даволі цяжкавата. Да таго ж гараж можа быць зачынены. За гэты час будзе папсавана маёмасць коштам у тысячы долараў.

— Напрыклад, у гаражы можна захоўваць да 20 літраў паліва, — кажа Мікалай Туравец. — Але змяшчацца яно павінна толькі ў металічных каністрах. Дапускаецца таксама выкарыстанне пластыкавых антыстатычных ёмістасцяў. Гэта патрэбна для таго, каб падчас пералівання не праскочыла іскра. У апаратах электрычнай аховы часам выкарыстоўваецца самаробныя плаўкія ўстаўкі — гэта калі магутнасць падключаных агрэгатаў такая, што не вытрымліваюць засцерагальнікі. Праўда, калі адбудзецца кароткае замыканне, то «жучок» сваю місію не выканае. Яшчэ адна сур'ёзная праблема — уладкаванне «шэрых» рамонтных майстэрань у гаражах. Законным шляхам пераафарміць гараж для гэтай справы можна. Але збор неабходных заключэнняў будзе вымагаць часу. Некаторыя ж так і працягваюць працаваць неафіцыйна. Даводзілася бачыць, як сістэму асвятлення перарабляюць на манер «лямпачкі Ільіча» — гэта значыць, вісіць простая лямпачка на шнуры. А вогнетушыцель мусіць мець аб'ём не менш за пяць літраў.

## БЫЎ ГАРАЖ — СТАЎ СКЛАД

Падчас праверак ратавальнікі часта сутыкаюцца з тым, што гаражы выкарыстоўваюцца ў якасці склада якіх-небудзь тавараў. Рабіць гэта ўладальнікам або арандатарам катэгарычна забаронена. Але, як казаў адзін вядомы літаратурны персанаж, глядзець трэба ў корань. Напрыклад, у Мінску кошт квадратнага метра складскіх памяшканняў даволі высокі.

### Будзь у курсе

**Першачарговая мэта ратавальнікаў падчас правядзення пажарнага нагляду ў гаражах — не выпісаць шмат штрафаў, а растлумачыць, чаму нельга парушаць правілы бяспекі. Праўда, за выкарыстанне самаробных печак і некалібраваных плаўкіх уставак гаспадар рызыкуе атрымаць штраф на месцы. Для фізічнай асобы санкцыі складаюць да 30 базавых велічынь. Але ўсё залежыць ад абставін канкрэтнай справы.**

Арандаваць жа гараж можна за невялікія грошы — напрыклад, на інтэрнэт-пляцоўках за пабудову плошчай стандартным памерам 6 на 3 метры просяць менш за 100 рублёў у месяц. А калі ў гаражы ёсць падвал, то плошча яго павялічваецца ледзь не ўдвая.

— Асабіста я падчас праверак сустракаў такія імправізаваныя склады з агароднінай, садавінай і бытавой тэхнікай. Проста іх вельмі цяжка выявіць. Машына прыехала, загрузілася за пару-тройку дзясяткаў хвілін і тут жа з'ехала. Таму пабачыць гэта можна толькі падчас непасрэдных загрузачных работ... Пачакайце, а што гэта тут робіцца?

І з гэтымі словамі Мікалай Туравец тармозіць аўтамабіль. Парушальнікаў знайшлі ў гэты раз выпадкова — з аднаго з гаражоў выносілі цюкі з нейкім таварам і грузілі ў мікрааўтобус. Адразу відаць, што тут знаходзіцца склад, — нейкімі скруткамі быў забіты нават падвал. Грузчыкі асабліва гаманкімі не аказаліся, але тэлефонны нумар уладальніка гаража ўсё ж паведамілі. Гаспадар прыехаў праз 10 хвілін. Праўда, факт парушэння прызнаў адразу і паабяцаў усё ліквідаваць.

— Паверым, але праверым, — кажа Мікалай Туравец.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Здарэнні

### Скраў туі са сталічнага праспекта

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС г. Мінска затрымалі 44-гадовага жыхара сталіцы, які за некалькі дзён здзейсніў крадзеж 24 туй з праспекта Пераможцаў. Агульная сума шкоды склала каля 840 рублёў.**

Міліцыянеры ўстанавілі, што пасля ён прадаў дрэўцы на адным з рынкаў горада. Заведзена крымінальная справа. Фігуранту пагражае пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ, або штрафу, або папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, або арышту, або абмежавання волі на тэрмін да трох гадоў, або пазбаўлення волі на той жа тэрмін, паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска. Вядома, што раней мужчына прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за ўчыненне аналагічнага дзеяння. Затрыманы змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання ГУУС Мінгарвыканкама.

### Жанчына з апёкамі пайшла да маці

**Пра пажар у кватэры па вуліцы 60 гадоў СССР чавускім ратавальнікам паведамілі суседзі.**

Калі на месца выкліку прыбылі падраздзяленні МНС, у калідоры жылля гарэў матрац, назіралася шчыльнае задымленне. У спальні быў знойдзены муж гаспадыні, які сядзеў на падлозе, яго вывелі на свежае паветра. Мужчына не пацярпеў. Таксама на падлозе, але на кухні, быў знойдзены без прытомнасці госць гаспадароў, яго шпіталізавалі ў бальніцу з атручэннем. Трэцяй удзельніцай здарэння была гаспадыня кватэры. Жанчына атрымала апёкі, але да прыбыцця ратавальнікаў пайшла ў дом сваёй маці. Ужо адтуль яе з апёкамі другой-трэцяй ступені забрала хуткая медыцынская дапамога. Як мяркуецца, прычынай пажару магла стаць неасцярожнасць пры курэнні.

### «Пежо» «ўляцеў» пад балкон

**Кіроўцу легкавіка «Пежо-306», які ўехаў у жылы дом, дэблакіравалі ратавальнікі ў Лідзе.**

Здарэнне адбылося а палове на другую гадзіну ночы. У МНС паведамілі пра дарожна-транспартнае здарэнне на вуліцы Рэспубліканскай, патрэбна была дапамога па дастаўленні кіроўцы з машыны. На месцы высветлілася, што кіроўца пры руху ўехаў пад балкон пяціпавярховага жылога дома. У выніку сутыкнення ён быў заблакіраваны элементамі кузава. Пры дапамозе спецыяльнага інструмента мужчыну дасталі і з траўмамі рознай ступені цяжкасці шпіталізавалі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17 |
| **Предмет аукциона: объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Витебская обл., Дубровенский р-н, Малобаховский с/с, 4** | |
| **Башня водонапорная,** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **241/С-7052**, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол, технологический колодец | |
| **Башня водонапорная**, (сооружение специализированное водохозяйственного назначения), инв. номер **241/С-7054**, составные части и принадлежности: резервуар бак, ствол. | |
| **Дорога асфальтобетонная**, (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7053** | |
| **Эстрада**, (сооружение специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения), **241/С-7055** | |
| **Бассейн,** (сооружение специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), инв. номер **241/С-7056** | |
| **Уборная**, (здание специализированное иного назначения), инв. номер **241/С-7057**, общ. пл. **25,5** кв. м | |
| **Овощехранилище**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7058**, общ. пл. **35** кв. м, составные части и принадлежности: сход | |
| **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7059**, общ .пл. **38,1** кв. м | |
| **Кладовая**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), **241/С-7060**, общ. пл. **30,3** кв. м | |
| **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер 241/С-7061, общ. пл. **101,2** кв. м | |
| **Прачечная**, (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер **241/С-7062**, **18,9** кв. м | |
| **Столовая**, (здание специализированное для общественного питания), инв. номер **241/С-7063**, общ. пл. **591,3** кв. м, составные части и принадлежности: три пристройки, навес | |
| **Подсобные помещения**, (здание специализированное иного назначения), инв. номер **241/С-7064**, общ. пл. **11,1** кв. м | |
| **Здание насосной**, (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7065**, общ. пл. **18,5** кв. м | |
| **Здание насосной**, (здание специализированное коммунального хозяйства), инв. номер **241/С-7066**, общ. пл.**16,6** кв. м | |
| **Здание склада**, (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ), инв. номер **241/С-7067**, общ. пл. **92,9** кв. м | |
| **Баня**, (здание специализированное для бытового обслуживания населения), инв. номер **241/С-7068**, общ. пл. **93,3** кв. м | |
| **Сведения о земельном участке**: предмет аукциона расположен на земельном участке с кадастровым номером 222482900001000003, общ. пл. 2,8148 га, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений пионерского лагеря «Дружба» (участок №1). Ограничения (обременения) прав: водоохранная зона водного объекта (река Днепр), площадь 1,5907 га; ограничения (обременения) прав: водоохранная зона водного объекта (ручей Табора), площадь 0,7600 га; ограничения (обременения) прав: водоохранная зона водного объекта (ручей Табора), площадь 0,3695 га; ограничения (обременения) прав: прибрежная полоса водного объекта (река Днепр), площадь 0,0946 га; ограничения (обременения) прав: придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги, площадь 0,1000 га; ограничения (обременения) прав: охранная зона линии электропередачи напряжением свыше 1000 В, площадь 0,0330 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 131 964,38 белорусских рублей (снижена на 20 %) |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» в номере от 30.10.2018 | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **27.11.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.11.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторного аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Молодечненского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **магазина общей площадью 632,3 кв. м, инв. № 630/С-69297, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004279 площадью 0,3953 га (право аренды до 2111 года), по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 144**.

Часть Объекта (66,7 кв. м) сдается в аренду *(сведения об арендаторе можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20 %) – **869 081,05** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 86 908,00 бел. руб.). **Стоимость снижена на 15,5 %.**

**Задаток перечисляется на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.10.2018. Аукцион состоится **27.11.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.11.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

100 гадоў Беларуская ССР

# Зміцер Жылуновіч. ТАВАРЫШ ПЯСНЯР

## Ён быў аўтарам Маніфеста аб абвяшчэнні Савецкай Беларусі, першым прэм'ер-міністрам рэспублікі, яго двойчы выключалі з партыі, ён мог стаць першым народным паэтам...



Цішка Гартны з сям'ёй. Жонка Надзея і дачка Галіна (ужо студэнтка медуніверсітэта) улетку 1937-га былі рэпрэсаваны «за неданясенне» і высланыя ў Ленінградскую вобласць. Жонка там і згінула, дачка жыла ў Мінску, была мовазнаўцай, сабрала кнігу ўспамінаў пра бацьку. Сын Андрэй, якога бацька перад арыштам паспеў адправіць да сваякоў у Ленінград, памёр у блакаду.

**На ўсіх фота, якія захаваліся да нашага часу — ці то з сям'ёй, ці то ў атачэнні таварышаў па барацьбе або калег-пісьменнікаў, — ён выглядае надзвычай інтэлігентным і кранальна безабаронным. Магчыма, гэта з-за круглых акуляраў з вельмі моцнымі дыоптрыямі — ён з маладосці дрэнна бачыў. А можа, на гэтых чорна-белых пабляклых фотаздымках амаль стагадовай даўніны нейкім дзівосным чынам захавалася для тых, хто будзе ведаць яго толькі па творах ды па ўспамінах іншых людзей, яго сапраўдная сутнасць — рамантыка, таленавітага пісьменніка, чалавека, які ўсё жыццё шукаў сябе, сваю долю, сваю Беларусь. Які ў гэтых няспынных пошуках прыйшоў у палітыку — справа ва ўсе часы не вельмі простая, а ў калатнечы паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі — і ўвогуле смяротна небяспечная. Зрэшты, у той час гэтаксама небяспечна было быць і паэтам. І пэўна, менавіта таму, што ў адной асобе аб'ядналіся беларускі дзяржаўны дзеяч Зміцер Хведаравіч Жылуновіч і вядомы беларускі пісьменнік Цішка Гартны, гэта асоба выглядае найбольш неадназначна, найбольш ярка і найбольш трагічна ў гісторыі двух першых дзесяцігоддзяў БССР...**

### «Хіба на свет выйду, долю пашукаю...»

Чым больш даведваешся фактаў з яго біяграфіі — тым больш здзіўляешся: якім чынам у яго так усё атрымалася? Не «дзякуючы», а «насуперак» — як і ў многіх беларусаў, гэткая наша адметная нацыянальная рыса. Нарадзіўся ўвосень 1887 года ў Капылі ў вельмі беднай сям'і — бацька быў земляробам, маці наймалася ў падзёншчыкі. Хведар Жылуновіч навучыў свайго Зміттра пачатковай грамаце, якой валодаў сам, а ўзімку адправіў вучыцца да «дарэктара». Аб іншай адукацыі і размовы быць не магло — з ранняй вясны да позняй восені хлопец быў у пастухах.

Пастушка-падлетка захапілі рэвалюцыйныя ідэі, якія на мяжы стагоддзяў луналі ў паветры і якімі падзяліўся з ім крыху старэйшы «калега». Да таго ж ён яшчэ ўліваецца ў шэрагі рухавіка рэвалюцыі — пралетарыяту: асвойвае прафесію гарбара. Тыповая біяграфія барацьбіта за сацыяльную справядлівасць.

Ды толькі тут не ўсё так проста. Бо ў гэтага юнака шмат пытанняў, на якія ён хоча атрымаць адказы. А яшчэ гэтыя нізкі слоў, што пранасіцца ў галаве, складваюцца ў рыфмы, не даюць спакою... Ён нават збіраўся дабрацца па адказы на свае пытанні да Льва Талстога, паехаў у Кіеў, дзе безвынікова прапанаваў свае напісаныя па-руску вершы ў тамтэйшыя газеты. А потым у яго жыцці здарылася «Наша ніва», куды паслаў вершы на роднай мове. І ён, пасля публікацыі першых удалых твораў (першы верш — «Бяздольны», прысвечаны Янку Купалу) натхнёны поспехам, прыехаў у 1909 годзе ў Вільню, спадзеючыся, што будзе працаваць у рэдакцыі. У штат яго не прынялі, але ён працягвае пісаць туды не толькі новыя вершы, але і карэспандэнцыі з месцаў.

З чаго жыве? З гарбарскай справы. Працуе ў розных гарадах на заводах, у арцелях. Доўга не затрымліваецца — начальства хутка ўгадвае ў ім «падбухторшчыка». І — піша вершы. Яскрава-класавыя — як жа без іх? (у адказ на купалаўскае «Я — мужык-беларус, пан сахі і касы...» Цішка Гартны піша: «Я — рабочы-гарбар, рыцар працы цяжкой...»), — але ж і прагнізліва-лірычныя, тыя, пра якія той жа Купала напіша: «Цішка не «майструе вершаў», а пяе, пяе ўсёй сваёй набалелай душой, усім сваім сэрцам гарачым, кіпучым»...

Менавіта ў той час ён вызначыўся ў сваёй пазіцыі: «Я цяпер шчыры прыхільнік беларускай справы і ўсім сэрцам рвуся і б'юся за яе. Я падумаў так: можна быць і сацыялістам, і нацыяналістам...», — цытуе ў сваёй дакументальнай аповесці «Без эпітафіі» Эрнест Ялугін.

У дваццаць пяць гадоў ён едзе ў Пецярбург. Тут моцная беларуская суполка, вечары на кватэры Браніслава Эпімах-Шыпілы, дзе ён чытае свае вершы і ўрыўкі з яшчэ не скончанага рамана, які вядомы нам як «Сокі цаліны». Дбаннем таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» выходзіць першая кніга яго вершаў. І пішуцца новыя — пасля цяжкой работы на заводзе, пры кволым святле газніцы. Ён ужо не можа абыходзіцца без акуляраў, але ці ж гэта перашкода? Галоўнае — творчасць.

І канешне, — рэвалюцыя. Беларуская сацыялістычная грамада, да якой далучыўся яшчэ ў 1913-м, — ужо не проста суполка па інтарэсах, а значная палітычная сіла з выразна акрэсленай сацыялістычнай пазіцыяй. А тут яшчэ натоўпы бежанцаў з роднай зямлі, дзе лютуе вайна. Яго не мабілізавалі з-за дрэннага зроку. Але людзям, сарваным з месца, ён можа дапамагчы, даўшы ім надзею і роднае слова — у 1916 годзе ў Пецярбургу пад рэдактарствам Цішкі Гартнага пачынае выходзіць «Дзянніца» — газета на беларускай мове. Праўда, усяго некалькі месяцаў, бо фінансавыя цяжкасці. Лютаўская рэвалюцыя скаланула паветра, але не прынесла палёгкі ні ў справе нацыянальнай, ні ў сацыялістычнай. Ды і ў Беларускай сацыялістычнай грамадзе было не ўсё так гладка: людзі там былі розных поглядаў, разбіліся на «правых» і «левых» (Жылуновіч падтрымлівае «левых», іх жа і прадстаўляе на І Усебеларускім з'ездзе ў снежні 1917-га). А летам 1917-га Жылуновіч знаёміцца з Аляксандрам Чарвяковым. Што, напэўна, таксама паўплывала ўрэшце на яго выбар на карысць бальшавікоў.

### Прэм'ер на месяц

У студзені 1918-га прадстаўнікі розных беларускіх партый, якія падтрымліваюць платформу савецкай улады (Чарвякоў прадстаўляе бальшавікоў, Жылуновіч — «левае» крыло БСГ), прымаюць рашэнне аб стварэнні Беларускага нацыянальнага камісарыята. Саўнаркам адабрае гэтае рашэнне. Чарвякоў становіцца старшынёй Белнацкама, Жылуновіч — адказным сакратаром. Пад яго кіраўніцтвам адналяецца выхад «Дзянніцы». У ёй Зміцер Жылуновіч восенню 1918-га (па партыйнай прыналежнасці ўжо бальшавік, мала таго — ужо і кіраўнік беларускіх камуністычных секцый) заклікае цэнтральную ўладу «вызначыцца нарэшце з лёсам Беларусі».

Што адбывалася далей, як ствaралася Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі і яе Часовы ўрад, падрабязна расказвалася ў першай публікацыі нашай рубрыкі *(гл. «Звязду» ад 2 кастрычніка)*. Урад, як вядома, узначаліў Жылуновіч, але асноўная частка партфеляў была не ў «беларусаў», а ў «аблвыканкамзахаўцаў» на чале з Мясніковым, якія спачатку былі супраць якой бы то ні было беларускай дзяржаўнасці. У згаданай публікацыі гісторык Сяргей Траццяк, які займаецца вывучэннем менавіта таго перыяду, прыводзіць кур'ёз: прэм'ерам быў Жылуновіч, а пячатка, якая ставілася на ўрадавыя дакументы, была ў яго апанента Кнорына, які выдаваў яе толькі пад расліску. Зрэшты, часу высветліць адносіны ў членаў урада не было: ужо ў пачатку лютага 1919-га валявым рашэннем Масквы была створана аб'яднаная Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Літвы і Беларусі. З беларусаў у кіраўніцтве на пасадзе намесніка наркама асветы застаўся адзін Чарвякоў. А Жылуновіч (дакладней — Цішка Гартны) купіў новыя акуляры і паехаў у Харкаў рэдагаваць франтавую чырвонаармейскую газету.

Тут яшчэ варта дадаць адзін цікавы важны факт. Аўтарам «Маніфеста», які ўсяму свету паведаміў аб стварэнні ССРБ 1 студзеня 1919 года, з'яўляецца Зміцер Жылуновіч. У часопісе «Полымя» за 1928 год засталося сведчанне Аляксандра Чарвякова: «Адпаведнасць зместу, формы і палітычнага значэння Маніфеста надае яму вялікую сілу пераканальнасці, не страчаную ім і ў нашы дні. Гэты дакумент быў напісаны Цішкам Гартным».

### «Пара пісаць гісторыю»

Пасля лета 1920-га, калі БССР была адноўлена, а на чале рэспублікі стаў сябра і аднадумец Аляксандр Чарвякоў, для Жылуновіча настаў зорны час. Ён ужо не вярнуўся ў палітыку — хапіла працы на грамадска-асветніцкай ніве. Рэдагаваў газету «Савецкая Беларусь» (выходзіла да 1933 года, а яе «цёзка» «Советская Белоруссия» да 1937 года мела назву «Рабочий»). Узначаліў першае дзяржаўнае выдавецтва, фактычна стварыўшы яго. У 1923 годзе паехаў у Берлін, каб аддрукаваць там беларускія кнігі — падручнікі, літаратурныя творы. У тамтэйшых друкарой не знайшлося літар «ё» і «ў», і ён спецыяльна ездзіў у Лейпцыг сам іх заказваць... У выдавецтве, успаміналі пасля пісьменнікі, якія выжылі ў страшных 30-х, прывязчаў усіх, стараўся падтрымаць маладых. Андрэю Александровічу не толькі дапамагаў рабіць першыя крокі ў літаратуры, але і падкормліваў яго, шкадуючы. (Таго самага Александровіча, які праз колькі гадоў будзе кляйміць яго апошнімі словамі на пленуме Саюза пісьменнікаў як самага лютага «ворага народа».)

У 1922 годзе стварыў яшчэ адну пляцоўку для літаратараў — часопіс «Полымя». Кінуўшы кліч «Пара пісаць гісторыю рэвалюцыі!», сам напісаў некалькі работ па гісторыі Беларусі. Стаяў каля вытокаў Дзяржаўнага архіва. Плённа працаваў з аднадумцамі ў Інбелкультуры, разам з Коласам і Купалам стаў адным з першых акадэмікаў. Пісаў шмат — з рэвалюцыйным запалам, але ўсё ж з тымі пошукамі сэнсу жыцця і ўчынкаў чалавечых. (Пачытайце яго апавяданне «Больш за ўсіх», напісанае ў 1923 годзе.)

Быў вядомы і паважаны. У 1923 годзе мог стаць першым народным паэтам Беларусі — нібыта была адпаведная пастанова ЦК КПБ(б). Чаму пастанова не ажыццявілася? У выпадку з кімсьці іншым шукаў бы адказ, але ў Гартнага-Жылуновіча гэта выглядае проста часткай біяграфіі. Як і выпадак з яго выключэннем з партыі ў 1924 годзе тэрмінам на год — «за адрыванасць ад мас і абывацельскую псіхалогію». У ЦК прыслалі данос землякі-зайздроснікі: маўляў, удзельнічаў у пахаванні сваяка паводле царкоўных канонаў ды яшчэ і быў «па-буржуйску» апрануты — асабліва раздражняла аўтараў «сігнала» наяўнасць гальштука.

### «Дайце мне ўліцца ў агульны ток жыцця»

Гэта апошнія словы, якія, паводле сведкаў, Жылуновіч паўтараў у турэмнай камеры, а пасля ў магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы. Ці мог чалавек з яго поглядамі, з яго біяграфіяй ацалець у той калатнечы, якая пачалася ўжо ў канцы 20-х гадоў з барацьбы з «правым ухілам»? Ён у канцы 1927-га яшчэ паспеў адзначыць 40-гадовы юбілей і 20-годдзе творчасці — шырока, з вершамі-прысвячэннямі Купалы і Коласа. Але ва ўжо неспакойным 1928-м, сам аб тым не здагадваючыся, нарабіў «памылак»: рэдагуючы «Савецкую Беларусь», у дыскусіі аб рэпертуары беларускіх тэатраў стаў на бок аўтараў, якія былі за нацыянальныя п'есы, за што атрымаў спагнанне і пазбавіўся пасады галоўнага рэдактара. Не ўтрымаўся і ў крэсле кіраўніка «Полымя» — адмовіўся публікаваць паэму Александровіча (таго самага), бо ў ёй быў паклёп на сумленнага чалавека. І калі пачалі раскручваць справу «Саюза вызвалення Беларусі» — хто, як не ён, павінен быў адным з першых трапіць у «чыстку»?

Яго тады, у пачатку 30-х, не выслалі з Беларусі, як Язэпа Лёсіка і Вацлава Ластоўскага, у яго не хапіла духу налажыць на сябе рукі, як зрабіў Ігнатоўскі. Ён напісаў пакаянны артыкул, як зрабіў Чарвякоў. Але не дапамагло — з партыі яго ў 1930-м «вычысцілі» з фармулёўкай: «...за сувязь з чужымі і варожымі пралетарыяту нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі, і як фактычны рупар варожых сіл, які выкарыстоўвала ў сваіх мэтах нацыяналістычная контррэвалюцыя ў барацьбе з дыктатурай пралетарыяту»...

Зразумела было, што яго арышт — справа часу. Ён «перавыхоўваўся» — ездзіў агітаваць сялян уступаць у калгасы, прысвяціў гэтай тэме цэлую паэму «Зялёны шум». Вярнуўся да гарбарскай справы — пайшоў працаваць на завод «Камунар». А што было рабіць у той час у той краіне? Або не жыць (а як — калі сям'я: жонка, двое дзяцей), або спрабаваць выжыць (пакуль дазваляюць). Дарэчы, пра «выжыць». Верша, прысвечанага Сталіну, ён так ніводнага і не напісаў. На «чыстцы» тлумачыў: не дарос, маўляў, да таго ўзроўню, каб пісаць пра такога вялікага чалавека...

Яму дазвалялі выжыць нядоўга. Арыштавалі на пачатку другой, самай страшнай хвалі рэпрэсій — у лістападзе 1936 года. Рыхтавалі паказальны працэс — Беларусі яго вельмі не хапала, каб асоба такога маштабу на судзе была прызнаная ворагам народа (як у Маскве Зіноўеў і Каменеў). А тут і вядомы паэт, і дзяржаўны дзеяч. Не выйшла. Псіхіка таленавітага паэта не вытрымала фізічных, а больш маральных пакут. «Дайце мне ўліцца ў агульны ток жыцця», — адзінае, што чулі ад яго каты перад тым, як адправіць у магілёўскую псіхіятрычную бальніцу.

Там яго і не стала 11 красавіка 1937 года. Афіцыйная тагачасная версія — памёр ад гангрэны лёгкіх. Версія сучасная — скончыў жыццё самагубствам. У кнізе Эрнеста Ялугіна знаходзім нават, якім жудасным спосабам: ададраў ад падлогі ножку бальнічнага ложка і здолеў паставіць сабе на горла. У духу пісьменнікаў-экзістэнцыялістаў...

* * *

Зміцер Хведаравіч Жылуновіч (Цішка Гартны) быў пасмяротна рэабілітаваны двойчы — у 1955-м у грамадзянска-праваых адносінах, у 1988-м — поўная палітычная рэабілітацыя. У тым жа годзе яго імя (Жылуновіча) прысвоілі былой сталічнай вуліцы Жданава, што каля метро «Партызанская», а на наступны год яго імем (Цішкі Гартнага) назвалі яшчэ адну вуліцу ў тым жа Заводскім раёне Мінска. Такая вось двайная пашана, нібы нашчадкі двойчы прасілі прабачэння.

Гэта тапанімічная калізія праіснавала ў сталіцы даволі доўга, толькі ў 2004-м вуліцу імя Цішкі Гартнага назвалі інакш. Засталося на карце сталіцы імя дзяржаўнага дзеяча, першага беларускага прэм'ер-міністра Змітра Жылуновіча.

Вось цікава, якое б з гэтых імён, калі б мог, выбраў ён сам?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

# Трансфармацыя адукацыі: поўнае паглыбленне... у лічбу

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**— «Мы будзем або першыя, або ўжо не мае сэнсу, якія мы будзем» — гэта вашы словы, сказаныя паўгода таму. Скажыце, што ўжо зроблена для стварэння рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя? Ці не адстае нарматыўная база ад вашых планаў і задум?**

— Магу з упэўненасцю сцвярджаць, што ў нас ёсць дакладнае разуменне, куды і як нам рухацца далей. Падрыхтаваны шэраг важных дакументаў, ад якіх напрамую залежыць лічбавая трансфармацыя адукацыі. Яны будуць рэгламентаваць і стандартызаваць інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе, каб усё было зразумела і празрыста, асабліва з улікам нашага міжведамаснага ўзаемадзеяння. Працэсы трансфармацыі закрануць не толькі змястоўную частку адукацыі, але і сістэму кіравання. Вельмі вялікае значэнне мы надаём разуменню і прыняццю новых правіл усімі прафесіяналамі, якія працуюць у сістэме адукацыі. Каб гэтага дасягнуць, арганізуем канферэнцыі і форумы, прыцягваем найлепшых спецыялістаў з усяго свету, каб тыя падзяліліся сваім досведам.

**«Маючы доступ да ўсіх даных свету, проста недаравальна гэтым не скарыстацца».**

Рэспубліканскае інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе прапісана як частка мерапрыемства ў Дзяржаўнай праграме развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2016—2010 гады. Заўважу, што рэгламенты дзеяння падобнага асяроддзя будуць адкрыты і для дзяржаўных, і для прыватных партнёраў. Уся інфраструктура павінна быць празрыстай і зразумелай як нам (тым, хто ёй кіруе), так і тым, хто ёй карыстаецца.

Мы ўжо падалі на ўзгадненне калегам у іншыя міністэрствы праект указа кіраўніка дзяржавы, які «ўзаконіць» стварэнне інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя, парадак узаемадзеяння і кіравання. Наш выбар — платформавы падыход, дзе ўваход у сістэму будзе адзіны. Гэта значыць, што з яго можна будзе трапіць на інфармацыю любога ўзроўню: ад простага даведачнага тэксту да складаных сэрвісаў. Прычым гэта можа зрабіць любы ўдзельнік адукацыйнага працэсу: ад школьніка да прадстаўніка найвышэйшага менеджменту ў адукацыі. Толькі ўзровень доступу да інфармацыі будзе адрозніваецца ў розных катэгорый. Адзіная платформа ахопіць усе ўзроўні адукацыі, стане часткай электроннага ўрада, адпаведна, закрые ўсе патрэбы ў зборы і апрацоўцы даных.

Да 2020 года праект «Электронная школа» павінен ахапіць ужо 80 працэнтаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Навучальныя ўстановы аб'ядноўваюць у адзіную інфармацыйную сістэму з элементамі статыстычнага аналізу. На кожным узроўні прадугледжана свая спецыфіка. Так, для школ будзе дзейнічаць адзіная платформа па электронным журнале, а ўласнікам інфармацыі стане Міністэрства адукацыі.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Аналітыка для кіраўнікоў

**— Усе кажуць, што настаўнікаў даўно трэба вызваліць ад руцінных запытаў і вялікай колькасці нікому не патрэбных звестак, якія толькі загружаюць педагогаў. А «Электронная школа» зможа разгрузіць педагогаў? Ці паралельна з электронным журналам яны па-ранейшаму будуць вымушаны весці і папяровы іх варыянт?**

— Канчатковая мэта менавіта так і выглядае — настаўнік павінен займацца найперш педагагічнай дзейнасцю, а электронны журнал будзе генерыраваць справаздачнасць. Але пакольк ў ім фігуруюць персанальныя звесткі навучэнцаў, такія журналы павінны быць атэставаныя па бяспецы, і тое, што не атэстуюць, будзе забаронена. Я разумею, што пазбегнуць пераходнага перыяду ў нас не атрымаецца, хоць бы таму, што для засваення педагогамі патрэбных навыкаў і кампетэнцый патрабуецца пэўны час, трэба паклапаціцца і аб праграмах павышэння кваліфікацыі для настаўнікаў. Нягледзячы на лічбавізацыю працэсаў, у цэнтры ўсіх перамен усё роўна знаходзіцца чалавек — з яго і трэба пачынаць.

Я, напрыклад, вельмі хачу, каб папяровых журналаў увогуле не было, але па нашым заканадаўстве папяровы журнал з'яўляецца юрыдычным і бухгалтарскім дакументам, які здаецца ў архіў. А ўнясенне карэкціровак — не вельмі хуткі працэс. Сёння мы не кіруемся прынцыпам «а давайце аблічбуем усё». Трэба ацаніць усе працэсы і непатрэбныя ўвогуле выключыць з нашай практыкі. Паколькі ГІАЦ займаецца інфармацыйнымі тэхналогіямі, мы можам толькі прапанаваць спецыялістам, якія адказваюць за арганізацыю адукацыйнага працэсу, шмат ад чаго адмовіцца. Трэба задаць сабе пытанне, што трэба адкінуць, каб з дапамогай лічбавых тэхналогій з новай хуткасцю рушыць наперад.

**— Ведаю, што ўжо створаны рэгістр навучэнцаў. А якая інфармацыя пра школьнікаў будзе ў ім акумулявацца?**

— Я прыхільнік таго, каб збіраць усе звесткі, бо невядома, што ў патоку вялікіх даных можа аказацца заканамернасцю. Наша задача — максімальна спрасціць працэс іх збору, забяспечыць іх праўдзівасць, а потым укараніць сістэму аналітыкі, якая дапаможа выявіць самыя розныя заканамернасці. І ўжо на іх падставе будуць прымацца хуткія рашэнні, як змяніць сістэму адукацыі і з пункту погляду кіравання, і ў плане яе змястоўнага напаўнення. Мы можам уносіць у наш рэгістр самыя розныя даныя, збіраць звесткі пра навучэнца, пачынаючы з дашкольнай установы і да выпуску з універсітэта: пра яго спартыўныя і алімпіядныя поспехі, прагназаваць, куды далей ён можа паступіць з улікам яго паспяховасці і схільнасці да тых ці іншых навук. Маючы звесткі пра паспяховасць навучэнцаў у засваенні тых ці іншых прадметаў па ўсёй краіне, можна будзе прымаць кропкавыя кіраўніцкія рашэнні па карэкціроўцы, напрыклад навучальных праграм, па дапамозе пэўным рэгіёнам і пэўным навучальным установам.

**«Нельга стаць адукаваным, проста робячы запыты ў «Гугл».**

Пры стварэнні рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя мы вывучалі вопыт вельмі многіх краін: Кітая, Расіі, Германіі, Аўстрыі, Англіі, Польшчы, Фінляндыі, Эстоніі... Электронныя сістэмы кіравання ў тым ці іншым выглядзе дзейнічаюць паўсюдна, але са сваімі нюансамі, якія залежаць і ад узроўню лічбавых кампетэнцый у кіраўніцкага і педагагічнага звяна, і ад маштабаў краіны, і ад колькасці ўстаноў, ахопленых гэтымі сістэмамі. Прычым мы вывучалі не толькі дзяржаўны досвед, але і досвед буйных прыватных кампаній, у якіх ёсць уласныя адукацыйныя цэнтры і акадэміі з дзясяткамі тысяч супрацоўнікаў. Яны таксама займаюцца прагназаваннем і маніторынгам. Рэспубліканскае інфармацыйна-адукацыйнае асяроддзе мы стваралі з улікам чужога досведу, чужых памылак і, канешне, з улікам нашых рэалій і патрэб.

Узяць тую ж Эстонію, якая лічыцца адной з самых «прасунутых» краін у развіцці лічбавых тэхналогій, — яна ў дзесяць разоў меншая за Беларусь. Там лічбавую трансфармацыю распачыналі з фармулявання асноўнай ідэі: доступ у інтэрнэт — гэта канстытуцыйнае права кожнага грамадзяніна, як доступ да вады ці паветра. У сярэдзіне нулявых гадоў гэта насамрэч гучала вельмі інавацыйна. Але сёння ў нас доступ да інтэрнэту з мабільных прылад — амаль паўсюдны, і педагогам трэба з гэтым лічыцца. Усе хатнія заданні ўжо ёсць у сеціве, там можна знайсці праграмныя прадукты, якія дапамагаюць рашыць любыя задачкі. І ўзнікае заканамернае пытанне: як рэагаваць на такую рэчаіснасць? Маючы доступ да ўсіх даных свету, проста недаравальна гэтым не скарыстацца.

## Каб не перавозіць паветра...

**— Але сёння педагогі і псіхолагі кажуць ужо пра «эфект Гугл» — калі запамінаецца не змест, а месца знаходжання інфармацыі, шлях да яе. Заўважана, што сярэдняя працягласць канцэнтрацыі ўвагі ў сучасных дзяцей значна меншая, чым была раней, у пакалення «гугл» знікае здольнасць чытаць і разумець вялікія тэксты, арыентавацца без інтэрнэт-картаў на мясцовасці. Гэта ўсё пабочныя эфекты сучаснай цывілізацыі...**

— Сто гадоў таму не ўсе людзі ўмелі чытаць, а сёння ўсе ўмеюць чытаць, але не ўсе хочуць гэта рабіць. На жаль, я нават за сабой заўважыў, што спажыванне інфармацыі моцна змянілася: калі дзесяць гадоў назад я шмат чытаў, то цяпер шмат гляджу: напрыклад, праглядаю тыя ж лекцыі ў інтэрнэце, відэа, дзе аўтары кніг зачытваюць урыўкі са сваіх твораў. Для эканоміі часу нават мой слых адаптаваўся да перамоткі: я гляджу ўсё на падвоенай хуткасці. Гэта рэчаіснасць, якую можна або адмаўляць, або прыняць. Таму я лічу, што дзяцей трэба вучыць новым кампетэнцыям: уменню арыентавацца ў вялікіх патоках інфармацыі, уменню здабываць яе, структураваць, адфільтроўваць важную і карысную ад другаснай, непраўдзівай ці ўвогуле фэйкавай. Калі чалавек у стане сфармуляваць праблему і знайсці яе рашэнне, не мае значэння, як ён спажывае інфармацыю. Нельга стаць адукаваным, проста робячы запыты ў «Гугл».

На маю думку, школьны курс інфарматыкі трэба прывязаць да набору кампетэнцый, якія вучань павінен атрымаць пасля яго засваення. Самы неэфектыўны спосаб навучання — калі настаўнік ці выкладчык расказвае, а школьнікі і студэнты слухаюць, таму што пачутае хутка забываецца. І зусім іншая рэч — візуалізацыя... Нацыянальны інстытут адукацыі актыўна працуе над стварэннем праграмных прадуктаў для школы, каб не атрымалася так, што мы праклādзём рэйкі, запусцім цягнікі, але тыя будуць перавозіць у вагонах паветра. Разам з тым думаем, як прыцягнуць у нашу школу міжнародныя праграмныя прадукты, напрыклад на прыродазнаўчых навуках, таму што законы фізікі — аднолькавыя для ўсіх...

Ёсць думка, што адукацыя павінна развіваць толькі тое, з чым не можа справіцца штучны інтэлект: гэта творчасць, крэатыўнасць, навыкі праектнай дзейнасці, планавання, расстаноўкі прыярытэтаў, уменне прымаць рашэнні, фарміраваць каманду, здольнасць рызыкаваць, эксперыментаваць, прадумляць, мысліць крытычна. Абавязкова трэба развіваць у дзяцей праектнае мысленне і ўменне працаваць у камандзе. Калі клас дзеліцца на праектныя групы, ты ўжо не можаш проста спісаць у суседа па парце — вы ўсе разам павінны дасягнуць пэўнага выніку.

**— У канцы лістапада пройдзе ўжо другая міжнародная спецыялізаваная выстаўка-форум «Інфармацыйныя тэхналогіі ў адукацыі». Што вы рыхтуеце для яе наведвальнікаў?**

— Мерапрыемствы форуму будуць праходзіць на пляцоўках Falcon Club Minsk тры дні — з 28 па 30 лістапада. ITE 2018 абяцае стаць адным з самых маштабных мерапрыемстваў года ў адукацыі. На яго запрошаны 72 спікеры — вядучыя беларускія і замежныя спецыялісты ў інфарматызацыі: член Савета па развіцці лічбавай эканомікі, старшыня экспертнага савета ПВТ Аляксандр Курбацкі, рэктар БДУІР Вадзім Богуш, кіраўнік прадстаўніцтва «Майкрасофт» у Беларусі Антон Мякішаў, эксперт у галіне Webometrics Энрыке Ордуна-Мале (Іспанія), адукацыйны тэхнолаг Талінскай цэнтральнай рускай гімназіі Людміла Раждзественская (Эстонія), старшы дырэктар па распрацоўцы праграмнага забеспячэння кампаніі «Эпам Сістэмс» Павел Лібер і іншыя. Дзелавая праграма форуму ўключае канферэнцыі «Лічбавы ўніверсітэт», «Менеджмент універсітэцкіх бібліятэк». Пры падтрымцы Сусветнага банка пройдзе міжнародная канферэнцыя «Інфармацыйная сістэма кіравання ў сектары адукацыі: найлепшыя сусветныя практыкі для Беларусі». Асацыяцыя «Адукацыя для будучыні» арганізуе панэльную дыскусію на тэму «Якая школьная інфарматыка патрэбная для IT-краіны». Будуць абмяркоўвацца STEM-падыходы ў адукацыі. Запланаваны таксама круглыя сталы «Лічбавы каледж», «Інфармацыйная бяспека ў адукацыі». Пройдзе фінал рэспубліканскага конкурсу праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу».

Адначасова будуць дзейнічаць пяць пляцовак: вялікая, разлічаная на тысячу чалавек, і чатыры — на 100 чалавек. І вызначыцца з выбарам, каго вы хочаце паслухаць, будзе даволі складана. Напрыклад, эксперт з Іспаніі раскажа, як беларускім ВНУ ўвайсці ў топ-100 Webometrics, а адукацыйны тэхнолаг з Талінскай цэнтральнай рускай гімназіі падзеліцца сваім досведам і вынікамі ўкаранення IT-тэхналогій у краінах замежжа і СНД. Мы плануем, што форум збярэ за тры дні каля пяці тысяч удзельнікаў. Далучыцца да яго можа кожны, каго цікавіць тэма і хто жадае павысіць сваю лічбавую адукаванасць. Удзел ва ўсіх мерапрыемствах — бясплатны. Але пажадана папярэдне зарэгістравацца **на сайце ite.unibel.by.**

Афіцыйнымі партнёрамі ITE 2018 выступаюць беларускія і замежныя кампаніі — лідары ў сферы інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій. Інавацыйныя партнёры — Парк высокіх тэхналогій і IT-Academy.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



# ЗЯМЛІ НАДЗЕЙНАЯ АПОРА

**Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці**

# УСЁ, ЧАГО ЖАДАЕ ДУША, У РАЁНЕ ЁСЦЬ

**Так лічыць старшыня Дзяржынскага райвыканкама Мікалай АРЦЮШКЕВІЧ, і ён мае рацыю. Раён займае першае месца ў Мінскай вобласці па вытворчасці збожжа, і другое — па вырабе малака. У рэспубліканскім конкурсе асемянатараў раённыя спецыялісты сёлета ўзялі другое месца, а вакансій тут больш, чым беспрацоўных. Умовы працы на вёсцы прываблівають на пераезд нават гараджан з Дзяржынска. Тут вам і зарплата, і жыллё ледзьве не адразу, і садок са школай на месцы. Мікалай Іванавіч расказаў, як атрымоўваецца забяспечваць працаўнікам сельгаспрадпрыемстваў усе гэтыя выгоды.**



## Уласнымі сіламі — танней і якасней

Прыпыняць работу ў сельскай гаспадарцы нельга ў любы сезон. І самы галоўны кірунак тут, як ні дзіўна, — будаўніцтва, адзначае старшыня:

— Тэхналогіі работы на зямлі і атрымання ўраджаю збожжавых намі ўжо адпрацаваны. У малочнай галіне таксама працуем па самых сучасных тэхналогіях. А яшчэ ва ўсіх гаспадарках раёна ўжо асвоілі схему будаўніцтва гаспадарчым спосабам (уласнымі сіламі) — так выходзіць утрая танней, чым на падрадзе. Пры гэтым якасць значна вышэйшая, бо людзі будуюць самі для сябе. І паспяваюць больш, і ўнутранасць робяць, як трэба, пад пэўныя задачы.

Узводзяць не толькі будынкі пад фермы, але і жыллё. У раёне гатова некалькі праектаў на будаўніцтва 12-кватэрнага жылля гарадскога тыпу ў аграгарадках, чакаюць толькі крэдытаў, каб пачаць. Такога кшталту жыллё ў калгасах цяпер больш запатрабавана, чым асобныя домікі, кажа старшыня, ды і эканамічна больш выгадна. Метр у такім шматкватэрным доме каштуе 90—100 рублёў, а ў індывідуальным — 150.

Тым не менш асобныя домікі на сяле з'яўляюцца. У гаспадарцы «Маяк-78», напрыклад, штогод дзве-тры такія новабудоўлі ўздымаюцца. А яшчэ ў раёне перарабляюць пад кватэры будынкі былых дзіцячых садкоў. Так наваселле могуць справіць адразу пяць-шэсць сем'яў.

— Нават гараджане сёння ідуць у гаспадарку трактарыстамі ды механізатарамі, бо і зарплата тут на ўзроўні, і добры сацпакет. Адно цяжка: летам праца без выхадных, таму многія не вытрымліваюць, сыходзяць, — уздыхае Мікалай Арцюшкевіч. — Стараемся ўзімку гэта кампенсаваць скарочанымі днямі і дадатковымі выхаднымі.

З работай у раёне праблем няма. «Заданне было стварыць сёлета ў раёне 500 рабочых месцаў, а іх у нас з'явілася ўжо 632», сцвярджае старшыня.

Штогод Дзяржынскі раён стабільна павялічвае паказчыкі надояў, сёлета з пачатку года прыбавілі 46 кілаграмаў на карову, і гэта яшчэ досыць сціпла, лічыць кіраўнік раёна:

— Прырост крыху меншы, чым летась. Сказваецца актыўнае будаўніцтва малочнатаварных комплексаў (МТК) і перавод жывёл з прывязнога на бяспрывязнае ўтрыманне. Гэта крыху стрымлівае лічбы, але ў далейшым мы на комплексах атрымліваем добрыя прыбаўкі.

Летась МТК скончылі ў вёсцы Баравікі. Сёлета два комплексы ўвялі ў гаспадарках «Крутагор'е-Петкавічы» і «Маяк-78», яшчэ два — завяршаюць, а да канца 2019-га ў раёне плануюць збудаваць як мінімум даільную залу і адно памяшканне чарговага МТК.

## Надвор'е + вопыт = выдатны вынік

— Скончыць усе палявыя работы ў раёне да прафесійнага свята было справай гонару, — кажа Мікалай Арцюшкевіч. — Летась гэта не ўдалося, бо вераснёўскія дажджы ішлі да самай зімы, працаваць у полі было немагчыма. Сёлетняя ж восень была для працаўнікоў залатая.

Уборку завяршылі своечасова дзякуючы добраму надвор'ю і згуртаванай працы спецыялістаў, лічыць і **Андрэй АТРУШКЕВІЧ, першы намеснік старшыні Дзяржынскага райвыканкама.**

Цяпер застаецца рэалізоўваць прадукцыю і атрымліваць прыбытак. Штодня 1,5—2 тысячы тон буракоў, напрыклад, адпраўляюцца на Гарадзейскі цукровы камбінат. Збіралі буракі, дарэчы, кругласутачна, у дзве змены, бо тэхніка дазваляе працаваць і ў цемры. А яшчэ ў ёй камфортна. Не кожная іншамарка мае такі клімат-кантроль, як імпартныя камбайны гаспадаркі.

— Чым больш бурак застаецца ў зямлі, тым больш ён расце. І трэба злавіць момант, калі ён набярэ дастаткова цукру і максімальна вырасце, што дазволіць атрымаць максімум пры яго рэалізацыі, — тлумачыць намеснік старшыні. — Сёлета ўраджайнасць склала больш за 500 цэнтнераў з гектара, а значыць, заспелі найлепшы час для ўборкі.

Вынікі ўборачнай кіраўнік раёна расцэньвае як сярэднія. Збожжавых і каласавых сёлета амаль удвая меней, чым летась, — 89 тысяч тон супраць леташніх 116. Аднак гэты недабор замясцілі 40 тысячамі тон зерня кукурузы, якой летась было адно 24 тысячы. Тым не менш буйная рагатая і птушыная гаспадарка раёна павялічваецца з такой хуткасцю, што, каб пракарміць яе, прыходзіцца дакупляць зерне.

— Працягнем работу па пераглядзе і ўдасканаленні структуры пасяўных плошчаў, каб павялічыць вытворчасць збожжавых. Асабліва гэта датычыцца нізкаўрадлівых пясчаных зямель, дзе каласавыя растуць не вельмі добра, затое кукуруза дае 100 цэнтнераў з гектара, — сцвярджае кіраўнік раёна. — Гэта рацыянальнае выкарыстанне зямель. Сёлета, напрыклад, мы паменшылі на 300 гектараў плошчы пад буракі, аднак валавы збор іх не меншы, чым летась, — каля 103 тысяч тон. На 100 гектараў скарацілі і плошчы пад бульбу, аднак сабралі яе столькі ж, як і ў 2017-м. Такім чынам затраты на вырошчванне мы знізілі, а ў прадукцыі не згубілі.

**Ад душы дзякую ўсім працаўнікам Дзяржынскага раёна, якія нястомна павышаюць дабрабыт нашага краю, і віншую іх з прафесійным святам. Асаблівая ўдзячнасць кіраўнікам гаспадарак, якія сёлета зрабілі шмат і дасягнулі добрых вынікаў у жывёлагадоўлі і раслінаводстве.**

**Гэта Юрый КЛІМАШ, кіраўнік гаспадаркі «Крутагор'е-Петкавічы», Рыгор НІКАЛАЕВІЧ, дырэктар «Баравое-2003», Уладзімір ЛЯЎША, галава аграпрадпрыемства «Кастрычніцкая рэвалюцыя», Іван ГАРГУН, які ўзначальвае «Маяк-78», Арцём КОЧАТАЎ, галава ўнітарнага прадпрыемства «Логавішча-Агра». Кіраўнік «Агракамбіната «Дзяржынскі» Уладзімір ЛУК'ЯНАЎ і дырэктары філіялаў прадпрыемства: «Пяцігор'я» — Пётр ЯРЫЖАНЕЦ, «Фалько-Агра» — Вадзім КУНЦ, «Праўда-Агра» — Віталь ХАЦЬКО. Асобная падзяка кіраўніку агракамбіната «Ждановічы» Рыгору ЧУЙКО. Яго гаспадарка пастаянна і плённа ўзаемадзейнічае з Дзяржынскім раёнам і з'яўляецца арыенцірам для паляпшэння паказчыкаў нашымі прадпрыемствамі.**

**Гэты год быў добры, і няхай наступныя прынясуць яшчэ большую прыбаўку і абыходзяцца без прыродных катаклізмаў. А людзям нашым жадаю здароўя, імпэту і сямейнага шчасця, якое і бадзёрасць дае, і на працу натхняе.**

ОАО «КРУТОГОРЬЕ-ПЕТКОВИЧИ»

# ПАСПЯХОВАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА — ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ І ДАБРАБЫТУ КОЖНАЙ СЯМ'І

**Так лічыць дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ**



«На гэтым камені ўвесь летапіс гаспадаркі», — гаворыць дырэктар Юрый КЛІМАШ.

*— Вялікі дзякуй калектыву за працу, працоўныя дасягненні. Практычна ўсе задачы, якія былі пастаўлены перад спецыялістамі, работнікамі, выкананы. Поспехаў і дабрабыту нашаму прадпрыемству! Калі будзе поспех у прадпрыемства, то поспех гарантаваны для кожнай сям'і, паколькі дастатак залежыць ад таго, якая сітуацыя ў гаспадарцы. Таму — цярпення, мудрасці, любові адзін да аднаго, да агульнай справы. Праца ў сельскай гаспадарцы — гэта не проста працэс, а лад, стыль жыцця. Для таго каб плённа працаваць на вёсцы, трэба гэтым жыць, а не проста хадзіць на работу. Здароўя ўсім работнікам, іх сем'ям, усім працаўнікам сяла! Не толькі нашай гаспадаркі, але і раёна, вобласці, краіны. Здароўе — гэта галоўнае, астатняе прыкладзецца. Усё можна зарабіць, вырасціць, толькі, каб была мэта. А для выканання пастаўленых задач на сённяшні дзень у нас усё ёсць.*

**Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў адной з самых паспяховых гаспадарак Дзяржынскага раёна і даведалася, як тут працуюць, аб планах на будучыню і перспектывах развіцця.**

— Перспектыў і жаданняў зашмат — адначасова не ахопіш. Усё залежыць не толькі ад нас, але і ад кіраўніцтва раёна, вобласці. Нам адназначна неабходна расшыраць сельскагаспадарчыя ўгоддзі, паколькі на сённяшні дзень у гаспадарцы вялікая шчыльнасць жывёлы: 96 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 33 дойныя каровы на гектар сельгасугоддзяў, свіней — больш як 545 галоў на гектар ворыва, — расказвае **дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Крутагор'е-Петкавічы» Юрый КЛІМАШ.** — Налета плануем пачаць будаўніцтва новага малочнатаварнага комплексу, ужо прыступілі да ўзвядзення і рэканструкцыі двух памяшканняў для ўтрымання сухастойных кароў. Цяпер уводзім у эксплуатацыю цэх халастых і паросных свінаматак на свінагадоўчым комплексе. На днях пачнём запаўняць памяшканне. Акрамя таго, заканчваем добраўпарадкаванне новага малочнатаварнага комплексу ў Малых Навасёлках, каб здаць яго пад ключ. Пабудавалі яго гаспадарчым спосабам у рэкордна сціслыя тэрміны — роўна за два гады. На сённяшні дзень комплекс запоўнены цалкам сваёй жывёлай.

Варта сказаць, што ў ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» пралічваюць свае крокі і дзеянні на перспектыву, як сапраўдныя гаспадары выкарыстоўваюць не толькі кожны гектар зямлі, кілаграм малака, але і нерухомасць. Напрыклад, у адным з памяшканняў, якое прыдатнае для харчовых мэт, пасля рэканструкцыі адкрыюць цэх малочнай перапрацоўкі, дзе плануюць у суткі перапрацоўваць да 20 тон малака ўласнай вытворчасці. У гаспадарцы плануюць павялічыць вытворчасць мясной прадукцыі мінімум у паўтара-два разы, вядзецца рэканструкцыя мяса-каўбаснага і забойнага цэхаў.

— Гэта дазволіць выпускаць у суткі 6—7 тон прадукцыі і перапрацоўваць сыравіну на 90 %. Сёння гэты паказчык на ўзроўні 65—70 %, — канстатуе Юрый Пятровіч. — Усяго ж у месяц выпускаем каля 75 тон каўбасных і мясных вырабаў, штодзень прадаём дзяржаве 43,5 тоны малака. Дарэчы, у летні сезон рэалізоўвалі 48—49 тон «белага золата» ў суткі.

На канчатковы вынік завязаны ўсе сферы дзейнасці, у тым ліку і будаўніцтва. Вядома, гэта не асноўная вытворчасць, але без яе, як кажуць, не будзе руху наперад.

— Мы паставілі перад сабой задачу ўсе плошчы, дзе размешчаны вытворчыя памяшканні, «узяць» у бетон: гноесховішчы, пад'язныя шляхі, пляцоўкі, дарогі. Калі ў мінулым годзе закупілі 343 тоны цэменту, то сёлета ўжо каля 580 тон. Толькі адным перасоўным міні-заводам уклалі 6,5 тысячы тон бетону на розных аб'ектах, — адзначае дырэктар.






Спецыялісты гаспадаркі. Злева направа: Ганна ІВАНОВІЧ — эканаміст, Вікторыя ШАЎЦОВА — бухгалтар, Ірына КРЫВАРОТ — намеснік галоўнага бухгалтара, Жанна АНДРЭЙЧЫКАВА — галоўны бухгалтар (у цэнтры за сталом), спецыялісты па арганізацыі закупак Ала КУЛАЖАНКА і Алена ПАЎЛЮЧЭНКА, Ніна ЛОЖАЧНІК — спецыяліст па арганізацыі працы, Алена КРУГЛІК — таваразнавец, Жанна ПАДЗЯНКОВА — бухгалтар,Таццяна ТАРАНТУХІНА — галоўны эканаміст (справа на крэсле).

У гаспадарцы добра разумеюць, што вытворчыя паказчыкі залежаць ад умоў пражывання, быту, адпачынку людзей. Таму і ўдзяляюць значную ўвагу жыллёвым пытанням. Дзяржынскі раённы выканаўчы камітэт перадаў таварыству бясплатна тры будынкі, дзе раней месціліся сельскія клубныя ўстановы. Дзве з іх пасля рамонту прыстасавалі пад інтэрнаты, засялілі людзей. У вёсцы Нявелічы, напрыклад, уладкавалі дзве двухпакаёвыя і тры аднапакаёвыя кватэры з агульнай кухняй, санвузлом. Там усё зроблена па-сучаснаму: душавыя, пліты, цэнтральнае ацяпленне. Пачынаецца рэканструкцыя трэцяга клуба ў вёсцы Дзягільна.

*(Заканчэнне на 8-й стар. )*


Падрыхтоўка да зімы.

# ПАСПЯХОВАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА — ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ І ДАБРАБЫТУ КОЖНАЙ СЯМ'І

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Сёлета зрабілі суперсучасны рамонт сталовай гаспадарчым спосабам усяго за два месяцы, закупілі неабходнае абсталяванне, мэблю. Цяпер вялікая зала здаецца ў арэнду для банкетаў. Словам, усё скіравана на тое, каб зарабляць грошы. Гаспадарка валодае фірменнымі магазінамі: у Фаніпалі, Дзяржынску, вёсцы Петкавічы. У пасёлку Энергетыкаў раней плошчы пад краму арандавалі. Цяпер будынак выкупілі, рамантуюць. Прадукцыю, якая рэалізуецца пад брэндам «Мясны дом», ацанілі не толькі мясцовыя пакупнікі, але і жыхары Мінска, навакольных раёнаў, пра што сведчаць пастаянныя чэргі.

— Сыравіну на перапрацоўку ў старонніх прадпрыемстваў мы не бяром. Выкарыстоўваем толькі сваю, паколькі ведаем, як даглядаем жывёлу, чым кормім і які прадукт атрымліваем на выхадзе. У каўбасных вырабах не выкарыстоўваем сою, эмульгатары. Толькі натуральнае ахаладжанае мяса. Колер сапраўднага мяса павінен быць не чырвоны, а шэры, — канстатуе Юрый Клімаш. — Тое ж самае хочам зрабіць і па малаку. У перапрацоўчым цэху не будзе шырокага асартыменту. Галоўнае, каб прадукты былі натуральныя. Не сакрэт, чым меншы тэрмін захоўвання, тым лепшыя вырабы. І наогул мы ставім перад сабой мэту зрабіць нашу сельгасарганізацыю адной вялікай натуральнай фермерскай гаспадаркай. Інакш кажучы, выпускаць толькі якасную, натуральную прадукцыю. Мы атрымалі сертыфікат адпаведнасці, які дазваляе прадаваць прадукцыю за мяжу. Для гэтага неабходна было выканаць шэраг патрабаванняў, санітарных нормаў, паставіць сістэму ахаладжвання, якая круглы год падтрымлівае тэмпературу 12 градусаў. Але на сённяшні дзень праблем з рэалізацыяй прадукцыі няма, мы нават не можам задаволіць попыт на яе ўсіх спажыўцоў.

Наогул у гаспадарцы ўлічваюць прадукцыю не па вале, а па яе рэалізацыі. Дакладны аналіз, улік даюць свой вынік. Напрыклад, ступень пакрыцця затрат выручкай складае 107 %. Інакш, рубель уклалі, а зарабілі 1,07 рубля. За студзень — верасень рост валавой прадукцыі на ўзроўні 105,9 %, выручка ад рэалізацыі — 111,9 %. Заработная плата павялічылася на 106,7 %. На адзін бала-гектар атрымана прыбытку 12 рублёў — рост 108,6 %. Іншымі словамі, не проста расце выручка, а ўзрастае эфектыўнасць работы з зямлёй. Гэта сведчыць пра тое, што зямля выкарыстоўваецца максімальна, не адзін тэхналагічны сельскагаспадарчы цыкл. Хлебаробы ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» паспяваюць пасадзіць прамежкавыя культуры і сабраць ураджай.

Ну, і вядома, у гэтыя поспехі вялікі ўклад уносяць прафесіяналы сваёй справы: спецыялісты, жывёлаводы, механізатары, даяркі. Менавіта ім і роднай гаспадарцы прысвечаны 30-хвілінны фільм, які сёлета знялі. Упершыню частку яго прэзентуюць на Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці.

— Хочам, каб засталася памяць аб нашай гаспадарцы, яе працаўніках, — лічыць Юрый Клімаш. — Мы адшукалі фільм беларускага тэлебачання, сюжэт якога расказвае пра ўвод у дзеянне першых калгасных домікаў. На юбілеі прадпрыемства мы яго дэманстравалі. Цяпер хочам знанціраваць з сучасным фільмам і паказаць усю гісторыю, дасягненні гаспадаркі, у тым ліку і праз інтэрв'ю працаўнікоў, спецыялістаў. На 85-годдзе нашай арганізацыі ўстанавілі таксама вялікі камень з скверы з мемарыяльнай дошкай, дзе напісалі храналогію падзей розных перыядаў з жыцця гаспадаркі. Для гэтага паднялі ўсе архіўныя дакументы, удалося знайсці нават пратакол першага сходу, прозвішчы першых калгаснікаў, хто і якую маёмасць здаў у калектыўную гаспадарку.

## Алена Велічава, выконваючая абавязкі загадчыцы сталовай:



— Памяшканне сталовай непазнавальна змянілася як унутры, так і звонку. Літаральна за два месяцы сельгасарганізацыя сваімі сіламі, гаспадарчым спосабам зрабіла еўрарамонт дзвюх залаў, пафарбавала будынак, які цяпер зззяе вясёлымі колерамі. Мала таго, кіраўніцтва закупіла сучаснае кухоннае, халадзільнае абсталяванне, пліты, мэблю, сталы, посуд. Цяпер не сорамна і гасцей запрасіць, і банкеты ладзіць. А людзі арандуюць памяшканне ахвотна для правядзення ўрачыстасцяў, карпаратыўных мерапрыемстваў, памінак. Арэнда, напрыклад, вялікай залы абыходзіцца ў суткі ў 200 рублёў. Гэта з улікам посуду, гатавання. Ды і так шмат кліентаў прыходзіць, не толькі свае. Нават з Дзяржынска прыязджаюць. Меню ў нас разнастайнае, абеды недарагія — каля 3-4 рублёў у залежнасці ад таго, што выбера чалавек. Свае работнікі харчуюцца па талонах, абед ім абыходзіцца ў 1 рубель 80 капеек, розніцу ў кошце даплачвае прадпрыемства. Даспадобы наведвальнікам выпечка, якую гатуем сваімі рукамі. Адносна недарагі кошт абедаў тлумачыцца тым, што гаспадарка забяспечвае сталовую гароднінай, бульбай, морквай, буракамі, капустай, мясам. Купляем толькі крупы, макарону.


Работнікі сталовай чакаюць наведвальнікаў.

Падчас асноўных сельскагаспадарчых кампаній механізатараў кормім у полі. Для гэтага спецыяльна абсталяваны тры машыны з тэрмасамі, рукамыйнікам. Падвячорак даём бясплатна.


Работнікі сталовай (злева направа): Аляксандр ДАВІДОВІЧ, Таццяна ЧАВУРА, Марыя БУГАЕВА, Наталля ХАРЧАНКА, Святлана ПЛАКСА і Алена ВЕЛІЧАВА.

## Святлана Старавойтава, намеснік начальніка малочнатаварнага комплексу «Малыя Навасёлкі»:


Святлана СТАРАВОЙТАВА ў даільнай зале з камп'ютарнай сістэмай кіравання.

— Працавала на старой ферме брыгадзірам. Цяпер на новым комплексе дапамагаю Жанне Асіпенцы, працуем з ёй у дзве змены.

Адно памяшканне цалкам запоўнена жывёлай, палова з іх дойныя каровы і цялушкі. Кармы раздаюцца аўтаматызавана, усталявана камп'ютарная дойка. На сённяшні дзень тут працуе тры даяркі, адна з іх падменная. Так што нашы аператары маюць выхадныя дні. Калі памяшканне запоўнім цалкам, то спатрэбіцца яшчэ жанчына. Надоі ў нас добрыя — і 23, і 28 кілаграмаў ад каровы ў суткі. Усё у залежнасці ад ацёлаў, пары года.

## Аляксандр Кісіцкі, галоўны інжынер:

— Пасля асноўных сельскагаспадарчых кампаній рамантуем тэхніку, рухавікі, вузлы трактароў. Усё робім сваімі сіламі. Хлопцы, малайцы, спраўляюцца.У райаграсэрвіс звяртаемся толькі тады, калі паломка адбылася па іх віне. У нас вялікі парк тэхнікі — каля 80 трактароў, 50 сельгасмашын, у тым ліку 12 збожжаўборачных і 7 кормаўборачных камбайнаў.

Уся складаная тэхніка захоўваецца ў памяшканнях, пад навесам, імкнёмся падтрымліваць яе ў належным стане. У гаспадарцы я працую дваццаць першы год. Прыехаў сюды пасля заканчэння інстытута механізацыі (цяпер Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт). Там жа вучыцца і сын, хоча стаць інжынерам, як і бацька. Жонка працуе ў сістэме сувязі. Гаспадарка выдзеліла дом, у якім жывём ужо трынаццаць гадоў, яго дазволілі прыватызаваць. Словам, прыжыліся тут, глыбока пусцілі карані.Так што нават думкі не ўзнікае наконт горада. У нас, лічы, створаны не горшыя за гарадскія ўмовы працы, быту, адпачынку.


У майстэрні вядзецца падрыхтоўка тэхнікі да наступнага года. Злева направа: Андрэй ГАРАЧКА, Аляксандр КІСІЦКІ (галоўны інжынер), Раман БРЫНДЗІКАЎ.


У дыспетчарскай. Злева направа: намеснік дырэктара па вытворчасці Дзмітрый СТАРАВОЙТАЎ і дыспетчар Ала ЛІСАВЕЦ.


Бульбасховішча. За адгрузкай бульбы. Злева направа: Ірына МАЗУР (загадчыца), Ларыса ЛЕМЯШЭЎСКАЯ і Таццяна БЕЛАВУС.

## Ларысу Гарачку, старшыню прафкама, мы засталі ў гароднінасховішчы:

— Перабіраем бульбу, фасуем у сеткі для продажу. Па 300 кілаграмаў клубняў выдаём сваім работнікам, па 150 кілаграмаў — пенсіянерам таварыства. Акрамя таго, даём бясплатна па сетцы капусты. Штомесяц кожны з нашых працаўнікоў атрымлівае па 8 кілаграмаў мяса па сабекошце — тры рублі за кілаграм, 30 літраў малака, коштам 32 капейкі за літр. На 23 лютага і 8 сакавіка ўсім работнікам выдзяляем па дзве базавыя велічыні. Да Дня работніка сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці кожнаму належыць 4 БВ, воінам-інтэрнацыяналістам да дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана — па 10. Да Дня маці шматдзетным сем'ям даём па чатыры базавыя, астатнім, хто выхоўвае менш як трох дзяцей, па дзве базавыя. Навагоднія падарункі атрымліваюць усе працуючыя — кожны на суму каля 50 рублёў ад наймальніка і па паўтара кілаграма цукерак — ад прафсаюза. Прадаём людзям яблыкі, гародніну, моркву, буракі. Усе ахвотныя наведваюць бясплатна за кошт прафсаюза канцэрты зорак беларускай і расійскай эстрады. Пабывалі на выступленнях Наташы Каралёвай, Ігара Нікалаева, Стаса П'ехі. Дзяцей возім у цырк, дэльфінарый. Пачынаючы са студзеня ўсім, хто жадае, выдаём па 5 абанементаў у басейн. Па калектыўным дагаворы былому кіраўніку, які адпрацаваў больш за 20 гадоў у гаспадарцы, плацім штомесяц 20 базавых велічынь.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК, Кастусь ДРОБАЎ.

УНП 600112675

# ХТО ПРАЦУЕ, ТАМУ І ШАНЦУЕ

## Лячэбнае малако, «падстрыжаныя» сенажаці і задаволеныя зайцы «Фалько-Агра»

**Кандыцыянеры ў трактарах, жыллё для кожнага работніка, мясныя бонусы... Гэтыя і іншыя выгоды прадпрыемства «Фалько-Агра» прываблiваюць да насамрэч даволі цяжкай сельскай працы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і нават гарадской прапіскай. А ўсё таму, што тыя, хто імкнецца працаваць і ўдасканальвацца, бачаць аддачу і падтрымку ад гаспадаркі. А яшчэ — разуменне і спагаду яе кіраўніка, які заўжды гатовы, здаецца, да любых раптоўнасцяў: сюрпрызаў прыроды ці нечаканых гасцей любога рангу.**


Дырэктар «Фалько-Агра» Вадзім КУНЦ.

### Не хваліся травою, а хваліся сенам

«Галоўнае, каб здароўе не падводзіла, а справіцца з астатнім мы сваім работнікам дапаможам», — сцвярджае **Вадзім КУНЦ, дырэктар філіяла «Фалько-Агра» адкрытага акцыянернага таварыства «Агракамбінат «Дзяржынскі»,** пакуль вязе наш звяздоўскі дэсант на адзін з малочнатаварных комплексаў (МТК) гаспадаркі. Па шляху бачым палі, ужо цалкам падрыхтаваныя да зімы.

Сёлета тут сабралі чатыры ўкосы люцэрны і тры ўкосы злакавых траў. Прычым сенажаці так дбайна і чыста прыбралі, што яны выглядаюць як «падстрыжаныя».

— Адыходзім на зімоўку ідэальна. Па вясне не будзе ўчасткаў, дзе камусьці прыйдзе ў галаву падпаліць леташнюю траву, бо яе проста не засталося, — кажа дырэктар. — Сёлета да вясны падрыхтавана значна больш зямлі, чым у папярэднія гады. Калі не здарыцца катаклізмаў, наступны год стане больш ураджайным, чым гэты.

Нягледзячы на засушлівае лета, з-за чаго недалічыліся рапсу і збожжа, спрацавалі ў гаспадарцы нядрэнна. Аб'ём кармоў дабралі кукурузай. Зернем атрымалі ад яе ўраджайнасць 144 цэнтнеры з гектара, а сіласам — 425. А па сухім рэчыве на агульнай корманарыхтоўцы сёлета назапасілі на 1250 тон больш, чым летась. Так што карміцца жывёлам будзе чым, зрэшты, як і заўжды. Скаціна «Фалько-Агра» корміцца тым, што нарыхтавана на ўласных палетках. Купляць дадатковае харчаванне не прыходзіцца, бо аб'ём свайго разлічаны з запасам на паўтара года. Па валавой вытворчасці тут мяркуюць выйсці на 101 %.


Механізатар Генадзь ХАФІЗАЎ.

Да прафесійнага свята амаль на ўсе палі «Фалько-Агра» ўжо ўнеслі арганіку і зааралі зямлю. Азімыя таксама ўсе пасаджаны. Наступнае поле весела зелянее лісцем — гэта рапс, які з-за цёплай восені крыху перабуяў, як яго ні стрымлівалі рэгулятарамі росту. Ён паспеў набраць цукроў і павінен добра перазімаваць, бо пункт росту яго непадалёк ад зямлі, так што градусаў 15 марозу перанясе.

— Затое як мясцовыя зайцы задаволеныя: для іх жа рапс — гэта капуста. Яны да зімы тут атлусцеюць. У ваколіцы іх шмат, і людзей без стрэльбы зусім не баяцца, — смяецца дырэктар, каментуючы навакольную карціну.

### Гараджане з вышэйшай адукацыяй і будучыя кіраўнікі

Многія работнікі трапляюць у гаспадарку пасля вытворчай практыкі ў «Фалько-Агра», падчас якой яны не толькі набіраюцца вопыту, але і зарабляюць грошы. Штогод тут працуюць студэнты з БДЭУ і БАТУ. Вось і зараз два бухгалтары вучацца і працуюць.

— Я адразу кажу студэнтам: практыка простая, што вы ўмееце? Нічога? Значыць, навучым. Можаш кіраваць трактарам? Будзеш кіроўцам. Хочаш быць памочнікам камбайнера? Калі ласка, — расказвае Вадзім Кунц. — Сёлета чалавек сем у нас было. З ліпеня па канец кастрычніка працавалі без адпачынку. За гэты час яны і шмат ведаў атрымалі, і асвоілі розныя напрамкі сельскай гаспадаркі. А ў мяне ёсць магчымасць адабраць сабе з практыкантаў самых лепшых на працу. Хтосьці застаецца, хтосьці вырастае з нашых рамак і ідзе далей. Нікога не трымаю, рыхтуем новых. Мая задача — паказаць, што сёння рэальна рабіць прадукцыю ў гаспадарцы і зарабляць. І чым больш іх будзе, тым лепш яны будуць гэта разумець.

Апошнім часам з Дзяржынска сталі прыходзіць жанчыны з вышэйшай інжынернай ці будаўнічай адукацыяй, каб стаць у гаспадарцы аператарамі машыннага даення.

— Магчыма, іх прываблівае і зарплата, і наш сацыяльны пакет, — мяркуе дырэктар. — На комплексах ужо выйшлі на стандартны васьмігадзінны рабочы дзень у тры змены, так што ўмовы палепшыліся. А калі ў гаспадарцы працуе пара, то яны ўжо мяса ў краме амаль не бяруць: хапае паўфабрыкатаў, якімі чатыры разы на год заахвочваюць супрацоўнікаў.

Штогод з гэтай невялічкай кузні кадраў стабільна выходзяць адзін-два кіраўнікі. А большасць спецыялістаў — з вышэйшай адукацыяй. Кіраўнік сцвярджае, што яму гэта выгадна:

— Такія людзі здольны вучыцца. Два-тры разы растлумачыў, што трэба рабіць, і справа пайшла. Я вучу таму, чаго не пішуць у кнігах, тлумачу даступнай, зразумелай мовай.


Токар 5-га разраду Іван КАСЯНІК вырабляе дэталь для грузавога прычэпа.

А яшчэ кіраўнік адпускае людзей у адпачынак не толькі ўзімку, а і летам, падчас «гарачай» пары, не прымушае працаваць без выхадных, каб людзі не валіліся з ног. «Нават вялікі заробак не ўтрымае чалавека, калі няма адпачынку», — разумее ён і клапоціцца яшчэ пра камфорт і бяспеку працы.

Налета большасць машын, нават старых трактароў, плануюць абсталяваць кандыцыянерамі, каб людзям было бяспечна і камфортна працаваць.

— На спёцы ў кабіне пад 50 градусаў — знаходзіцца там вельмі цяжка, таму я раю хлопцам больш піць і абавязкова паспаць падчас перапынку, — кажа дырэктар. — Часта моладзь таму і не хоча заставацца працаваць, бо няма належнага камфорту, а ў неспрыяльных умовах у чалавека вялікі знос. У сельскай гаспадарцы ўвогуле цяжка працаваць, не ў кожнага здароўя на гэта хопіць.

## Працоўны камфорт дае эканамічныя выгады





Памочнік начальніка малочнатаварнага комплексу «Вязынка» Аляксандр КАМЗОЛАЎ з дапамогай камп'ютара кантралюе рабочы працэс.

На пад'ездзе да МТК «Вязынка» бачым замілавальную карціну: каровы ходзяць па двары паміж двума будынкамі, сцены іх з густам распісаны малюнкамі з выявамі рагуль ды кветак. Любата ды і годзе! Далей — болей. Мясцовы мастак упрыгожыў і плот, і сцены ледзьве не ўсіх пабудоў комплексу. На ўваходзе ў адміністрацыйны будынак сустракае кароўка, а ўнутры па сцяне пляцецца вінаград. Далей цэлае памяшканне запоўнена матылькамі, праўда, не намаляванымі, а прыклеенымі да сцен. Такая прыгажосць навокал падымае настрой, і, думаецца, прыходзіць сюды на працу прыемна.

З такім меркаваннем не можа не пагадзіцца **Аляксандр КАМЗОЛАЎ, памочнік начальніка малочнатаварнага комплексу «Вязынка»,** які працуе тут чацвёрты год, прайшоўшы шлях ад рознарабочага да намесніка кіраўніка комплексу. Мужчына родам з Данецкай вобласці. На радзіме быў інжынерам-будаўніком аўтамабільных дарог і аэрадромаў. Прыехаў у Беларусь адзін, тут знайшоў жонку, займеў дзетак, цяпер атрымлівае адукацыю заатэхніка.

— Трэба было паказаць сваё стаўленне да работы і свае ўменні, і гэта заўважылі і ацанілі. Ужо пусціў карані ў гаспадарцы і вельмі ўдзячны за адносіны і дапамогу, — кажа ён.

Калектыў «Фалько-Агра», кажуць, увогуле інтэрнацыянальны. Раней было шмат перасяленцаў з Казахстана, многія з якіх цяпер ужо на пенсіі. Шмат украінцаў, якія працуюць на самых розных пасадах. Ёсць малдаване, татары, расіяне. «Я ж бяру на працу чалавека, які хоча рабіць, а не падбіраю па нацыянальнасці», — заўважае Вадзім Кунц.

З клопатам пра чалавека будуецца і ўся работа тут. Супрацоўнікі атрымліваюць у карыстанне жыллё, якое праз 15 гадоў работы ў гаспадарцы можна прыватызаваць. Нават пасля выхаду на пенсію людзі застаюцца жыць у выдзеленых дамах ці могуць набыць іх ва ўласнасць.

Нягледзячы на сучаснае абсталяванне МТК, тэхналагічна расці заўжды ёсць куды, упэўнены кіраўнік «Фалько-Агра»:

— Прагрэс не стаіць на месцы, а палепшаныя ўмовы працы даюць эканамічныя выгады. І мы заўжды вучымся: і я, і мае спецыялісты.

На будаўніцтва папярэдняга комплексу гаспадарка ўзяла крэдыт, які выплачвае дагэтуль. Каб знізіць нагрузку на бюджэт прадпрыемства, наступны МТК узводзяць сваімі сіламі, выкарыстоўваючы ўласныя сродкі і тэхніку. Наймаюць толькі бульдозер ды каток і бяруць крэдыт на абсталяванне. Налета новы аб'ект, разлічаны на 600 дойных кароў і цялушак, мяркуюць запусціць.


Слесар Сяргей АРНАУТ кантралюе работу даільнага абсталявання.

### Як пакорміш — так і падоіш

Малако «Фалько-Агра» не кісне, і гэта не жарт! Зрабіць з яго смятану ці тварог без заквасці немагчыма нават пасля трох дзён на сонцы ці тыдня ў халадзільніку. Пры гэтым у прадукт не дадаюць ніякіх рэчываў.



— Звычайна малако стэрылізуецца ці пастэрызуецца, каб пазбавіць яго ад бактэрый, а наша застаецца жывым, і ў ім няма ніякіх бактэрый. Яно фактычна лекавае, і яго выкарыстоўваюць для гатавання дзіцячага харчавання, — тлумачыць Вадзім Кунц. — Мы проста вытрымліваем тэхналогію, а якасць кармоў правяраем двойчы на месяц.

Дзякуючы павелічэнню надояў, а сёлета будзе каля 9600 кілаграмаў з каровы, прыбытак ад здачы малака ў гаспадарцы таксама крыху павялічыўся, нягледзячы на тое, што закупачны кошт на прадукцыю зменшыўся да 62 капеек за літр.


Аператары машыннага даення Алена РАМАШКА і Аксана ІВАНОВА за работай.

Памеры надояў залежаць не толькі ад харчавання, а і ад генаў жывёл.

— Паляпшаючы генетыку, мы штогод атрымліваем усё больш малака. Мы скрыжоўваем жывёл, якія даюць 8-9 тон малака на год з тымі, хто дае 13—15 тон, — тлумачыць дырэктар. — Каб атрымаць добры вынік, трэба, каб былі падрыхтаваныя кадры, здольныя ўлічваць генетычныя паказчыкі жывёл, тэхналагічныя магчымасці, якасць кармоў і своечасовасць усіх складальнікаў працэсу.

— І з псарыязам можна жыць добра, калі весці правільны лад жыцця: высыпацца, не пераядаць, не набіраць вагу, не курыць і не злоўжываць алкаголем, — кажа Аляксандр Лук'янаў. — Толькі ў 30 працэнтах выпадкаў псарыяз мае цяжкае цячэнне, у астатніх 70 працэнтах многія праявы можна змякчыць правільнымі паводзінамі. Нічога добрага не атрымаецца з разгульным ладам жыцця, хуткім наборам вагі. На працягу ўсяго жыцця такім хворым патрэбна пастаянная фізічная нагрузка.

Спецыяліст нагадаў, што гэта не інфекцыйная хвароба, і да такіх хворых не трэба ставіцца з апаскай — яны не ўяўляюць небяспекі і могуць наведваць басейны, саўны, цырульні.

— Псарыяз — сезонная хвароба, у 80 працэнтах выпадкаў гэта зімовы псарыяз, — расказвае **загадчык кафедры дэрматавенералогіі і касметалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ПАНКРАТАЎ.** — Але яго правакуе і абвастрае не холад, а адсутнасць ультрафіялету. І для такіх хворых прымяняюцца методыкі святлолячэння. Больш няшчасныя 10 працэнтаў хворых, у якіх ультрафіялет з'яўляецца правакуючым фактарам хваробы. Яшчэ 10 працэнтаў маюць змешаную форму.

У цяжкіх выпадках хваробу лечаць біялагічнымі прэпаратамі, прымяняюцца такія метады і ў нас. Пакуль гэтыя высокатэхналагічныя сродкі каштуюць нятанна — курсавое лячэнне аднаго пацыента ў год абыходзіцца ў 10-12 тысяч долараў.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**



# Жалеза каваць — не песні спяваць



Ці даводзілася вам калі-небудзь бачыць за работай сапраўднага каваля? Пэўна, не кожны можа пахваліцца, што быў сведкам таго, як з кавалка жалеза нараджаюцца рэчы. А вось мне пашанцавала, таксама як і тым, хто ў мінулыя выхадныя завітаў у вёску Азярцо, дзе сапраўдныя адмыслоўцы кавальскай справы дэманстравалі сваё майстэрства. Час і месца абраны невыпадкова. Па царкоўным календары нашы продкі ў сярэдзіне лістапада шанавалі святых Кузьму і Дзям'яна, якія з даўніх часоў лічыліся заступнікамі кавалёў. А каб госці свята сапраўды адчулі сувязь часу, месцам правядзення фестывалю стаў музей народнай архітэктуры і побыту пад адкрытым небам.

Здаўна кавалёў лічылі чараўнікамі. А як жа інакш: працуюць ноччу, кіруюць полымем і за кароткі час з цвёрдай матэрыі могуць зрабіць рэч цудоўнай прыгажосці. Як жа тут без цуду? Нават сёння, у XXI стагоддзі, кавальская справа цікавіць народ. Сведчаннем чаму людзі, якія, нягледзячы на непагадзь, прыйшлі на фестываль.

Тут шмат чаго цікавага можна было пабачыць і даведацца. Як працуе горан, што трэба рабіць, каб хутчэй плавілася жалеза, ці як па колеры полымя вызначыць тэмпературу. Майстар-клас для гасцей ладзілі прафесійныя кавалі Вадзім БУГЛАК *(на фота знізу)* з Івянца і Кастусь ПЯТРОЎСКІ *(на фота зверху)* з Ракава. Пад молатамі майстроў жалеза, нібыта пластылін, набывала неабходную форму. І ў хуткім часе кавалі прэзентавалі свае вырабы. Вадзім Буглак зрабіў абярэг, а Кастусь Пятроўскі выкаваў падкову — сімвал свята.

**Андрэй САЗОНАЎ.**









*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже права заключения договора аренды земельного участка

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14.

| Предмет аукциона, кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, срок аренды, размер начальной цены и задатка |
|---|
| Лот № 1. Право на заключение договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым № 225580400610000003, расположенного по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, Бильдюгский с/с, аг. Бильдюги, ул. Советская, площадью 0,0624 га, для строительства торгового павильона (назначение: земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (р. Белая). **Нач. цена:** 58,73 бел. руб. **Задаток:** 5,87 бел. руб. |
| Лот № 2. Право на заключение договора аренды сроком на 25 лет земельного участка с кадастровым № 225555100010000220, расположенного по адресу: Витебская обл., Шарковщинский р-н, г. п. Шарковщина, ул. Рабочая, площадью 2,0416 га, для строительства объекта «Деревообрабатывающее производство в г. п. Шарковщина, ул. Рабочая Шарковщинского района Витебской области» (назначение: размещение объектов обрабатывающей промышленности). Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт. **Нач. цена:** 68 851,75 бел. руб. **Задаток:** 6 885,18 бел. руб. |
| Дата, время и место проведения аукциона: 17.12.2018 в 14.00, г. п. Шарковщина, ул. Комсомольская, 15, в Шарковщинском райисполкоме. Срок внесения задатка и подачи документов: с 14.11.2018 с 8.30 по 14.12.2018 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY81AKBB36003300040000000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04002. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. Для участия в аукционе приглашаются граждане, индивидуальные предприниматели, юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, индивидуальных предпринимателей, юр. лиц) |

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола аукциона: внести плату за право заключения договора аренды зем. участка или часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, в т. ч. с гос. регистрацией создания этого участка; возместить в установленном порядке потери сельскохозяйственного производства в сумме 1 960,82 бел. руб. (лот № 1); после выполнения указанных действий заключить с Шарковщинским райисполкомом договор аренды земельного участка; осуществить в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды государственную регистрацию прав на земельный участок в Шарковщинском бюро Глубокского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; срок действия права аренды на земельный участок оканчивается по истечении 25 лет с момента гос. регистрации создания земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него. За три месяца до окончания срока аренды на земельный участок совместно с Шарковщинским райисполкомом в установленном порядке решить вопрос его дальнейшего использования; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение Шарковщинского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 1 год; приступить к занятию земельного участка (начать строительство) в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектно-сметной документации; снять на занимаемом участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации; завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией. Для участия в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, консолидированные участники и юр. лица (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный срок подают заявление на участие в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, с отметкой банка, заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; представителем иностранного юр. лица – легализованные копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, легализованные доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о фин. состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем иностранного гражданина – легализованная доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; консолидированными участниками представляются оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов предъявляется документ, удостоверяющий личность. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Контактные тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## Государственное предприятие «МГЦН» извещает о проведении 18 декабря 2018 г. аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды имущества в рамках 245-го открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной и иной собственности

| № предмета аукциона | Местонахождение имущества | Площадь (кв. м) | Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы или размер арендной платы | Начальная цена права заключения договора аренды объекта (руб.) | Целевое использование имущества | Сумма задатка (руб.) | Характеристика имущества и иные сведения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Арендодатель – УП «Жилье»,** тел. +375 (0177) 76-85-32 | | | | | | | |
| *1* | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Трусова, 45-1а | 31,0 | 2,0 | 124,85 | Под офис, склад, организацию торговли непродовольственной и (или) продовольственной группой товаров, предоставление услуг (кроме похоронных бюро, магазинов ритуальных услуг) | 12,40 | Помещение расположено на цокольном этаже жилого дома. Помещение обременений не имеет. **Срок аренды – 3 года.** (1*) |
| *2* | | 19,9 | 2,0 | 80,15 | | 8,00 | |
| | 1* Стены – блочные, вентиляция – естественная, отопление – центральное, освещение – электропроводка скрытая. Победитель аукциона обязан заключить договоры на: вывоз твердо-бытовых отходов, снабжение электрической энергией, пользование тепловой энергией в горячей воде, отпуск воды и прием сточных вод | | | | | | |
| **Арендодатель – Республиканское торговое унитарное предприятие «Торговый дом «Легпром»,** тел.: +375 (17) 203-08-37, +375 (29) 647-77-19 | | | | | | | |
| *3* | г. Минск, ул. Раковская, д. **18/1** | 351,4 | 0,5 – первые 3 года после ввода объекта в эксплуатацию; 2,0 – послед. период | 1 415,26 | Под административно-хозяйственные цели или иные цели, возможные на данном объекте по согласованию с арендодателем | 141,50 | Двухэтажное здание с подвальным помещением, расположенное в историческом центре г. Минска и шаговой доступности от станций метро «Немига», «Фрунзенская». Нуждается в реконструкции. **Является историко-культурной ценностью.** Имеются: отопление, естественное освещение, энергоснабжение, отдельный вход. Отсутствуют: водоснабжение, канализация, пожарная сигнализация. Изменение арендуемой площади согласно техническому паспорту на здание, **аренда с момента ввода здания в эксплуатацию сроком на 10 лет. (2*)** |
| | *2* Аренда с момента ввода объекта в эксплуатацию с условием финансирования за счет средств арендатора без последующей компенсации следующих работ и затрат по реконструкции здания: 1. оформление проектно-сметной документации; 2. закупка материалов и устройство наружных и внутренних отделочных работ; 3. закупка, поставка, монтаж внутренних инженерных систем и оборудования (водопровод, канализация, сантехническое оборудование, электроосвещение, пожарная сигнализация); 4. устройство наружной рекламы* | | | | | | |
| **Арендодатель – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минская дистанция гражданских сооружений,** тел.: +375 (17) 225-66-22, +375 (17) 225-22-25 | | | | | | | |
| *4* | Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Вокзальная, 11 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Беларусь». Год постройки – 2002. В здании есть отопление, электроснабжение, горячее и холодное водоснабжение и водоотведение. (3*) |
| 5 | Минская обл., Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ст. Ждановичи, 1 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании железнодорожного вокзала. Год постройки – 2011. В здании есть отопление, электроснабжение, горячее и холодное водоснабжение и водоотведение. (3*) |
| 6 | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Вокзальная, 27 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала. Год постройки – 1970. В здании есть отопление, электроснабжение, горячее и холодное водоснабжение и водоотведение. (3*) |
| 7 | Минская обл., Минский р-н, Михановичский с/с, аг. Михановичи | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Михановичи». Год постройки – 1944. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 8 | г. Минск, ул. Славянская, д. 35 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании специализированного железнодорожного транспорта. Год постройки – 1951. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 9 | Минская обл., Молодечненский р-н, участок железной дороги Минск – Вильнюс | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Олехновичи». Год постройки – 1950. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 10 | Минская обл., Минский р-н, участок дороги Минск – Молодечно (762 км – 786 км) | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Радошковичи». Год постройки – 1950. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 11 | Минская обл., Пуховичский р-н, г. п. Руденск, ул. Руденская, 11 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Руденск». Год постройки – 1944. В здании есть отопление, электроснабжение, горячее и холодное водоснабжение и водоотведение. (3*) |
| 12 | Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала. Год постройки – 1948. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 13 | г. Минск, ул. Подлесная, 97 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала. Год постройки – 1963. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 14 | Минская обл., Пуховичский р-н, ст. Талька | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала. Год постройки – 1984. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 15 | Минская обл., Молодечненский р-н, участок железной дороги Минск – Вильнюс (участок 15) | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала станции «Уша». Год постройки – 1970. В здании есть отопление, электроснабжение. (3*) |
| 16 | Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Железнодорожная, 7 | 1,0 | 128,88 руб. | 4,03 | Под размещение торгового вендингового автомата | 0,40 | Часть помещения в здании вокзала (на 50 мест). Год постройки – 1969. В здании есть отопление, электроснабжение, горячее и холодное водоснабжение и водоотведение. (3*) |
| | *3* После заключения договора аренды необходимо имущество застраховать. Самостоятельно заключить договор на электроэнергию. Все мероприятия и работы осуществляются арендатором собственными силами за счет собственных средств без последующего возмещения стоимости работ* | | | | | | |

**Договор аренды заключается сроком на пять лет, если иное не указано в настоящем извещении.**

**Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.**

Аукцион состоится **18 декабря 2018 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Возможность **осмотра Имущества**, право заключения договора аренды которого выставлено на аукцион, **обеспечивает арендодатель**.

**Организатор аукциона настоятельно рекомендует лицам, желающим участвовать в аукционе, уточнять у арендодателя возможность использования объекта под планируемые виды деятельности (в том числе с учетом требований санитарных и противопожарных норм), а также размер коммунальных платежей.**

Аукцион проводится в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049, а также иными актами законодательства.

Участвовать в аукционе могут юридические и физические лица, включая индивидуальных предпринимателей.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

– уплачивает задаток (юридические лица и индивидуальные предприниматели оплату производят **платежным поручением**!) по соответствующему предмету торгов (назначение платежа – **задаток для участия в аукционе № 245 от 18.12.2018 по предмету аукциона № ______**), перечисляемый на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, государственное предприятие «МГЦН» (сумма задатка по каждому предмету торгов указана в соответствующей графе таблицы). **Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов;**

– подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе с приложением следующих документов (бланк заявления можно получить у организатора аукциона):

***юридическое лицо – резидент Республики Беларусь:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***юридическое лицо – нерезидент Республики Беларусь:***

легализованной в установленном порядке копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иного эквивалентного доказательства юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

копии **платежного поручения** либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***индивидуальный предприниматель:***

копии документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;

копии **платежного поручения** о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

***физическое лицо*** – копии платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;

– заключает с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (далее – соглашение), бланк которого можно получить у организатора аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами и заключении соглашения:

физическое лицо, индивидуальный предприниматель предъявляют организатору аукциона документ, удостоверяющий личность;

представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов** и консультации по вопросам участия в аукционе **осуществляются с 15 ноября 2018 г. по 12 декабря 2018 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Заявления на участие в аукционе, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.**

**Порядок оформления участия в аукционе:** лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

*При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.*

**Порядок определения победителя аукциона:**

– торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

– аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

**Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 100 (сто) базовых величин на дату проведения аукциона.**

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить **на текущий (расчетный) счет арендодателя** сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. **Информация о затратах доводится до сведения участников перед началом аукциона**.

***Важно!*** *Договор аренды по результатам аукциона может быть заключен исключительно с участником аукциона, ставшим победителем (приравненным к нему лицом). Заключение договора аренды, целевое назначение которого предполагает осуществление предпринимательской деятельности, с субъектом, который в силу законодательства не может осуществлять названную деятельность, не допускается.*

**Договоры аренды имущества должны быть заключены в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.**

**Телефоны для справок: отдел аукционов** + 375 (17) 327 40 22, **отдел аренды:** + 375 (17) 327 41 70, 327 47 29, 328 36 57, **бухгалтерия** + 375 (17) 328 36 58. **Интернет: www.mgcn.by**

Свет захапленняў

# ГАДЗІННІК ДАЎ ПУЦЁЎКУ

## Магілёўскі майстар — пра талент, любоў да прафесіі і таямніцы старадаўніх гадзіннікаў

**У Міхаіла Кругліка са словам «зорка» вельмі прыемныя асацыяцыі. Менавіта так называўся самы першы гадзіннік, які ён адрамантаваў. А заадно адкрыў у сабе талент будучага майстра. У той час ён яшчэ вучыўся ў школе і нават не загадваў, кім стане ў дарослым жыцці. Ім тады кіравала выключна цікавасць.**

### КАШТОЎНЫ ПАДАРУНАК



— Я наогул быў вельмі цікаўны падлетак, усё, што трапляла ў рукі, разбіраў. У доме не было ніводнай цэлай цацкі, — усміхаецца Міхаіл. — Вось і той наручны гадзіннік «Зорка» быў спраўны, пакуль я да яго не дабраўся. Бабуля добра ведала пра мае здольнасці, таму хавала сваю каштоўнасць як мага далей — у куфар. Надзявала толькі тады, калі кудысьці ішла, напрыклад у краму. Рэч была вельмі дарагая. Гэта ж самыя першыя вырабы Угліцкага гадзіннікавага завода — на рубінах. Не кожны селянін, а жылі мы ў вёсцы Сямікаўка Бялыніцкага раёна, мог пахваліцца такім багаццем. Мой дзед займаўся гандлем і купіў жонцы падарунак, калі ездзіў у Маскву. У доме былі яшчэ насценныя ходзікі, але мяне спакушала бабуліна ўпрыгажэнне.

І аднойчы хлопец не ўтрымаўся. Прычыніў вечка куфра і выцягнуў гадзіннік. Аднекуль у руках з'явілася адвёртка. Дабраўца да механізма было цяжкавата, накрыўка аказалася вельмі шчыльна прыладжанай, але школьнік усё ж такі яе ўскрыў. Металічная пласцінка разгубленa дзынькнула аб падлогу, а ўслед за ёй пасыпалася і ўся астатняя начынка. Шкоднік не ведаў, што з гэтым рабіць, а таму сабраў усе маленькія дэталькі ў хустачку і засунуў за куфар, каб бабуля не знайшла. Ёй, зразумела, нічога расказваць не стаў. Вельмі баяўся. Бабуля ж, калі выявіла згубу, вельмі засмуцілася. Але ўнука вінаваціць не стала, бо, як той казаў, не злоўлены — не злодзей. Прайшло болей за паўгода пасля таго, як унук вярнуўся да бабулінага гадзінніка.

— У суседа быў такі ж, ды зламаўся, вось ён і аддаў яго мне, — расказвае Міхаіл. — Я ледзь не кінуўся ў скокі ад радасці, дастаў схаваныя дэталі і пачаў збіраць. А суседскі падарунак паклаў





побач, глядзеў, куды якую вось ставіць. Шмат часу правазіўся, але калі механізм зацікаў, быў на сёмым небе ад шчасця. Не ведаў, праўда, як паведаміць бабулі гэтую радасную навіну. Яна ж усё ніяк не магла забыцца пра сваю трагедыю. І тады я падкінуў ёй ідэю, што гадзіннік мог саслізнуць за куфар. Але, каб адсунуць яго ад сцяны, патрэбна была дапамога некалькіх моцных мужчын. Паклікалі суседзяў, адцягнулі і, сапраўды, гадзіннік знайшоўся. Бабуля падняла яго і аж расплакалася.

А ў хлопца з таго моманту быццам дар адкрыўся — стаў рамантаваць няспраўныя гадзіннікі ўсім аднавяскоўцам. Як пачатковец, грошы за сваю работу не браў, было цікава навучыцца збіраць розныя мадэлі, пачынаючы ад наручных і заканчваючы будзільнікамі і ходзікамі. Хутка мог злёту даць дыягназ паломцы. У асноўным ляцелі восі.

### НЕПАКОРНЫ «КАРЭЦ»

Дома ў Міхаіла гадзіннікам прысвечаны цэлы пакой. Ходзікі, «куранты», будзільнікі, марскія з анкерным ходам, лётныя — ціканне зліваецца ў адзіны манатонны гул, які супакойвае. Майстар аднекуль дастае скрыні з запчасткамі, і вочы разбягаюцца — цыферблаты, карпусы, стойкі, валікі, вушкі, шкельцы... Калісьці ён купляў запчасткі непасрэдна на адмысловых заводах. Тады гадзіннікі былі ва ўсіх і майстры па іх рамонце без справы не сумавалі. Зараз мужчына на пенсіі, але знаёмыя не забываюцца пра яго здольнасці. То адзін патэлефануе, то другі. І нясуць у асноўным гадзіннікі савецкай вытворчасці. Ведаюць, што такіх майстроў, як Міхаіл, сёння адзінкі. Гэта зараз ён можа сабраць механізм ледзь не ўсляпую, а ў маладосці прыходзілася трапляць у розныя сітуацыі.

Калі служыў у арміі, на Далёкім Усходзе, яго паслугамі карысталіся і камандзіры, і салдаты. Механізмы наладжваў з паўабарота, але аднойчы трапіла ў рукі незнаёмая мадэль — карэйскі варыянт. Саслужывец набыў модны па тых часах гадзіннік, які каштаваў 100 рублёў, але прадавец папярэдзіў: калі пашчасціць, працаваць будзе 200 гадоў, а калі стрэлкі стануць, ім ужо нічога не дапаможа. Міхаіл зацікавіўся пакупкай, але таварыш па службе не жадаў эксперыментаў. Угаворвалі яго цэлым узводам. І ён нарэшце здаўся. Амбіцыйны беларус лічыў, што нават такі «заморскі» варыянт прыйдзецца яму па зубах. І амаль што не памыліўся. Праўда, павазіцца прыйшлося цэлы год.

— Гэта была вельмі дарагая рэч, і я рызыкаваў, — згадвае ён тую даўнюю гісторыю. — Дамовіліся, што, калі не спраўлюся, вярну грошы. Сумненні з'явіліся толькі тады, калі разабраў гадзіннік. Ён разлецеўся, і я не паспеў запомніць канструкцыю. Збіраць дапамагалі ўсе мае саслужыўцы. Ставім пласцінку, спружынку, пласцінку, спружынку — бац, усё разлятаецца, і зноў прыходзіцца рабіць з пачатку. Работа карпатлівая. Быў момант, калі сябрам ужо гэта надакучыла і яны пачалі збіраць па рублі, каб дапамагчы мне разлічыцца з гаспадаром. Але я ўпарты, цярпення і ўсёдлівасці хапае. Бывала, і па начах сядзеў, але ўсё ж такі ажывіў «карэйца». Праўда, ненадоўга. Па няведанні парушыў герметыку. Але потым рамантаваў гадзіннікі любой складанасці, у тым ліку і з герметыкай. «Камандзірскія», напрыклад, ідуць ужо 30 гадоў.

### З ЛЕКАРСКІМ УХІЛАМ

Гадзіннікі — гэта для душы, а вучыцца пасля школы Міхаіл пайшоў на трактарыста. Нават год да арміі адпрацаваў у родным калгасе. А ўжо падчас службы засвоіў яшчэ адну прафесію — медыцынскую. Кажа, што пра медыцыну марыў нават раней, чым стаў гадзіннікамі займацца. І калі ў арміі спыталіся, хто можа кіраваць машынай, — ён са сваімі правамі трактарыста прамаўчаў, затое з гатоўнасцю падахвоціўся ісці ў санітары. Потым здаў іспыты на санінструктара, а затым на фельчара. І пасля службы нават некалькі гадоў працаваў у бальніцы.

— У мяне бабуля лячыла. Аднойчы прыснілася і загадала мне таксама лячыць. Ад яе ў спадчыну мне замовы засталіся. Калі бачу, што камусьці магу дапамагчы, не адмаўляю. Гадзіннікі, дарэчы, таксама рэагуюць на адхіленні ў арганізме. Аднойчы да маіх паслуг звярнулася жанчына. Перабраў яе механізм, пачысціў — карыстайцеся, калі ласка. А яна назаўтра тэлефануе — гадзіннік не ідзе. Я вельмі здзівіўся, бо дакладна ведаў, што ён спраўны. Забраў яго, дома адчыняю, а ён зноў забруджаны, пакрыты нейкай зялёнай. Я прапанаваў ёй правесці эксперымент — даў свой гадзіннік. Яна панасіла яго, і ён таксама хутка зламаўся. Гляджу, а ўнутры такі ж самы зялёны налёт. Пракансультаваўся з адным знаёмым урачом, ён выказаў здагадку, што ў жанчыны нешта не так са здароўем. Я з ёй пагутарыў і высветлілася, што ў яе праблемы са страўнікам. Ёй трэба было рабіць аперацыю, але яна не спяшалася. Затое пасля выпадку з гадзіннікам усё ж такі адважылася.

Яшчэ ў аднаго кліента зламаўся насценны гадзіннік. Ён прынёс яго да мяне, дастаў з сумкі, а механізм цікае. Вырашылі праверыць, наколькі яго хопіць. Павесілі на сцяну, чакаем, калі спыніцца, а ён ідзе. Праз месяц мужчына прыходзіць, а гадзіннік працуе. Занеслі да яго — стаў. Паглядзеў механізм, а там цэнтральнае кола крыху падагнутае. Паправіў яго, і «куранты» болей не «капрызілі». Цікава, што «за кампанію» з маімі яны ішлі нават з паломкай.

Міхаіл упэўнены, што механічныя гадзіннікі для дома самая што ні ёсць карысная рэч. Там, дзе яны цікаюць, прастора нібыта ачышчаецца. А вось да іх аналагаў на батарэйках у яго недавер. Такія, калі зламаюцца, можна адразу ж несці на сметнік. У іх і рамантаваць няма чаго. «У адрозненне ад механічных, электронныя толькі энергію забіраюць, — упэўнены майстар. — Нездарма да мяне нясуць шмат савецкіх гадзіннікаў. Там і дэталі надзейныя, і метал больш трывалы. А калі ёсць рубіны, то такім гадзіннікам зносу не будзе. Яны, можна лічыць, вечныя. Мне асабіста больш за ўсё падабаюцца «куранты» і ходзікі, тыя што з боем. Старыя людзі кажуць, што звон злых духаў зганяе. І гэта сапраўды так. Я ведаю».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Zамор'е

## РЫБАК ЗЛАВІЎ У МОРЫ НЕМАЎЛЯ

**У Новай Зеландыі рыбалоў выцягнуў з мора 18-месячнае дзіця, якое збегла ад бацькоў, паведамляе Associated Press.**

Гус Хат заўважыў дзіця, якое плыло па хвалях, калі правяраў пастаўленыя на пляжы донкі. Ён злавіў яго за руку і выцягнуў з вады. «Нават тады я лічыў, што гэта ўсяго толькі лялька, — успамінае мужчына. — Твар як з фарфору, валаскі намоклі. Але тут ён ціхенька піскнуў. «Божа мой, — думаю. — Гэта дзіця, прычым жывое». Хат аднёс хлопчыка ў размешчаны непадалёк палатачны лагер. Паводле слоў гаспадыні лагера Рэбекі Солтар, прамоклы малы быў вельмі бледны, а ў яго валасы і адзежу набіўся пясок.



Як высветлілася, бацькі немаўляці спалі ў лагеры і не заўважылі, як яно ўцякло з палаткі. Хлопчык змог дабрацца да мора, упаў у ваду і праплыў каля 15 метраў. «Калі б мяне там не было ці я прыйшоў на хвіліну пазней, то не ўбачыў бы яго», — адзначыў рыбалоў. Дзіця адвезлі ў бальніцу, пасля агляду ўрачы зрабілі выснову, што яно не пацярпела. Паліцыя не плануе прыцягваць яго бацькоў да адказнасці.

## У ШВЕЦЫІ ПАБІЛІСЯ ЗНАТАКІ КЛАСІЧНАЙ МУЗЫКІ

**На канцэрце класічнай музыкі ў шведскім горадзе Мальмё здарылася бойка, паведамляе выданне Washington Post.**



Лейпцыгскі аркестр Гевандхаўза выконваў Пятую сімфонію Малера, калі адна з слухачак стала з гучным шамаценнем разгортваць жавальную гумку. Малады чалавек на суседнім месцы кідаў у яе бок абураныя погляды, а калі гэта не дало чаканага эфекту, адабраў пакецік з гумкай і выкінуў яго. Пасля завяршэння канцэрта жанчына павярнулася да крыўдзіцеля, нешта сказала яму, а затым ударыла па твары з такой сілай, што акуляры хлопца паляцелі на падлогу. Яе спадарожнік схапіў маладога чалавека за кашулю і пачаў збіваць яго. Бойка працягвалася, пакуль не ўмяшаліся іншыя гледачы. Ці трапілі гэтыя аматары класічнай музыкі ў паліцыю, не паведамляецца.

## МУЖ НЕ ВЕДАЎ, ШТО ЖОНКА ХАЦЕЛА ЯГО ЗАБІЦЬ

**Суд англійскага горада Мейдстан, графства Кент, правёў слуханні па справе Хэйл Везерол, якая дзевяць месяцаў спрабавала забіць свайго мужа, якія ні аб чым не здагадваўся, паведамляе выданне The Mirror.**



Брытанка рабіла спробы забіць свайго 49-гадовага мужа Рэйманда, хворага на рак мозга, з лета 2017 года да ранняй вясны 2018-га. 32-гадовая Хэйл уступіла ў змову са сваім палюбоўнікам і найлепшым сябрам мужа Гленам Полардам і яго 20-гадовай дачкой Хізэр. За гэты час зламыснікі спрабавалі атруціць мужчыну, падарваць яго машыну і ўтапіць падчас рыбалкі. Рэйманд успрымаў тое, што адбываецца як «чараду здарэнняў, няўдач і супадзенняў». У гісторыі інтэрнэт-браўзера яго жонкі паліцэйскія выявілі запыты «тэхнікі ціхага забойства», «крэатыўныя спосабы забойства» і «16 крокаў, каб забіць кагосьці і не папасціся». Рэйманд зразумеў, што яго спрабуюць забіць, толькі пасля таго, як яму стрэлілі ў галаву: куля трапіла ў яго правую шчаку і выйшла праз левую. Непадалёк ад месца злачынства следчыя знайшлі кінутую машыну Хізэр Полард. Пракурор сцвярджае, што матывам замахаў на забойства былі інтымныя адносіны паміж Хэйл і Гленам Полардам. Дачка апошняга дапамагала злачынцам з любові да бацькі. Усе трое адмаўляюць сваё дачыненне да злачынства.

**Іван КУПАРВАС.**

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ЗАХАВАЦЬ ЧАСНОК ДА НАСТУПНАГА ЎРАДЖАЮ

**Існуе мноства спосабаў захавання часнаку, якія дазваляюць прадухіліць загніванне і высыханне агародніны. Вядома, галоўнае, перад тым як прыбраць на захоўванне, добра прасушыць часнок, каб яго паверхня загрубела. Для гэтага яго адпраўляюць у прахалоднае, сухое і абароненае ад прамых прамянёў сонца месца прыкладна на 7-10 дзён. Але засяродзімся менавіта на спосабах захоўвання.**

### Мука і соль

Галоўкі раскладваюць у слоікі і перасыпаюць соллю або мукой, пасля гэтага няшчыльна закрываюць накрыўкай.

### Сена

Захоўванне ў сене было вядома яшчэ нашым прабабулям. Трэба ўзяць скрыню, толькі не з суцэльнымі сценкамі, а з рэечнымі, пакласці ў яе пласт сена, не ўтрамбоўваючы. Пасля гэтага ў сена ўторкнуць галоўкі часнаку так, каб яны знаходзіліся на невялікай адлегласці адна ад адной. Скрыню паставіць у сухім і прахалодным месцы.



### Парафін

Гэты спосаб распаўсюджаны не так моцна, як папярэдні, аднак ён вельмі эфектыўны. Для пачатку трэба растапіць парафін, потым хутка акунаць у яго прасушаныя галоўкі часнаку і выкладваць на паперу або пергамент, каб парафін застыў. Апрацаваны такім спосабам часнок можа праляжаць захоўвацца нават у пакоі.

### Вакуумныя пакеты

А вось гэта ўжо вынаходка сучаснасці. Падрыхтаваны часнок складаюць у вакуумныя пакеты і захоўваюць у кладоўцы. Галоўнае — пакеты павінны быць якасныя, інакш ураджай захаваць не атрымаецца.

### Традыцыйныя косы

Здаўна часнок не абразалі, а заплаталі хвасты ў косы і падвешвалі ў прахалодным і сухім месцы. Так ён выдатна захоўваецца і не гніе.

### Свечка ці іншая крыніца адкрытага агню

Карэньчыкі часнаку апальваюць над свечкай і потым агародніну захоўваюць пры пакаёвай тэмпературы.

### Алей

А вось тут давядзецца папрацаваць — зубчыкі трэба ачысціць ад шалупіны і заліць алеем. Такі часнок выкарыстоўваюць для прыгатавання першых і другіх страў. Пры гэтым духмяны алей, насычаны сокам часнаку, выдатна падыходзіць для смажання і запраўкі салатаў.

### Слоік

Прасушаны часнок абразаюць, пакідаючы 2-3 см, потым складаюць у чысты сухі слоік і захоўваюць у кладоўцы, не закрываючы накрыўкай.

# ЦЫБУЛЯ ГНІЕ ПРЫ ЗАХОЎВАННІ



**Самыя распаўсюджаныя цыбулевыя хваробы пры захоўванні — шэрая і бактэрыяльная гнілі, а таксама вірусная мазаіка. Як іх лячыць, каб не страціць сабраны ўраджай?**

### Шэрая гніль

Гэта грыбковае захворванне пашкоджвае цыбулю яшчэ на градах, аднак найбольшую шкоду наносіць ёй падчас захоўвання і лічыцца самым небяспечным. Падчас захоўвання цыбуліны пачынаюць размякчацца ў верхняй частцы, на іх з'яўляюцца ўвагнутасці. За 1-2 месяцы такія цыбуліны згніваюць цалкам. Навобмацак яны мяккія, як быццам толькі што з духоўкі.

**Як змагацца?**

1. Падчас уборкі і пасля яе цыбулю трэба старанна аглядаць. Ураджай, які прайшоў адбор, рэкамендуецца добра высушыць, перш чым адпраўляць на захоўванне.

2. Каб не распаўсюджваць развіццё шэрай гнілі ў склепе, важна стварыць для цыбулі спрыяльныя ўмовы ўтрымання. Так, паветра можа быць прахалодным, але тэмпература не павінна апускацца ніжэй 3 °C.

3. Сырасць для цыбулі — страшны вораг. Вільготнасць 70 % і больш выводзіць цыбуліну са стану спакою, і яна кранаецца ў рост, пасля чаго адсырвае і загнівае.

### Мазаіка

Мазаіка цыбулі — віруснае захворванне, пераносчыкамі якога з'яўляюцца насякомыя (розныя віды тлі, часночны клешч і нематоды).

Прыглядзецца да пёраў цыбулі, пакуль яна расце. Насцярожыць павінны светла-жоўтыя або светла-зялёныя крапінкі або палоскі. Пакутуюць ад мазаікі і самі цыбуліны: яны драбнеюць і выцягваюцца. А калі іх прыбіраюць на захоўванне, яны не пераходзяць у стан спакою, а працягваюць «не спаць», з-за чаго восенню могуць пачаць прарастаць.

**Як змагацца?**

1. Трэба своечасова абараніць цыбулю ад шкоднікаў.

2. Адбракоўваць падазроныя экземпляры яшчэ ў той момант, калі цыбуля падрастае на градах.

3. Не варта вырошчваць цыбулю на адным і тым жа месцы.

### Бактэрыяльная гніль

Распазнаць бактэрыяльную гніль падчас уборкі ўраджаю вельмі складана. Інфекцыя выяўляе сябе толькі праз некаторы час.

Цыбуліна можа выглядаць здаровай і прыгожай, а ўнутры быць гнілой. Гніль ад цэнтра распаўсюджваецца да краю, заражаючы ўсю цыбуліну. Толькі праз пару месяцаў можна заўважыць слізкую шыйку і зразумець, што цыбуліна ахварэла хваробы.

**Як змагацца?**

Барацьба з пераносчыкамі захворвання: цыбульнай мухай, павуцінным кляшчом.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.34 | 17.13 | 8.39 |
| Віцебск — | 8.29 | 16.57 | 8.28 |
| Магілёў — | 8.25 | 17.03 | 8.38 |
| Гомель — | 8.15 | 17.05 | 8.50 |
| Гродна — | 8.49 | 17.29 | 8.40 |
| Брэст — | 8.43 | 17.36 | 8.53 |

### Месяц

*Маладзік 7 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

### Імяніны

*Пр. Ульяны, Аляксандра, Дзмітрыя, Дзям'яна.*
*К. Андрэя, Лаўрэнція, Уладзіміра, Юзафа.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 14 ЛІСТАПАДА




**1905** год — нарадзіўся (в. Баброўня, цяпер у Гродзенскім раёне) Міхась Васілёк (Міхаіл Восіпавіч Касцевіч), беларускі паэт. Быў літаратурным супрацоўнікам заходнебеларускага часопіса «Маланка», арганізоўваў гурткі Таварыства беларускай школы. Пісаў сатырычныя вершы. Аўтар зборнікаў грамадзянскай лірыкі «Шум баравы» і «З сялянскіх ніў», у якіх паэтызаваў вызваленчую барацьбу народа. За рэвалюцыйную дзейнасць і нацыянальна-вызваленчы характар твораў пераследаваўся польскімі ўладамі. У 1939 годзе быў мабілізаваны ў польскую армію, трапіў у нямецкі палон, адкуль у жніўні 1941 года ўцёк на радзіму. Быў сакратаром Скідзельскага падпольнага антыфашысцкага камітэта, супрацоўнічаў з партызанскім друкам. Памёр у 1960 годзе.

**1933** год — нарадзіўся (г. Мінск) Леанід Цімафеевіч Пракопчык, беларускі пісьменнік. Працаваў на Беларускім тэлебачанні, рэжысёрам мультфільмаў на кінастудыі «Беларусьфільм». Аўтар краязнаўчых нарысаў, сцэнарыст фільмаў «Навагрудак, чытаючы Міцкевіча», «Напалеон Орда», «Беларускія ратушы» і інш. Памёр у 1998 годзе.

**1973** год — старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін уручыў Беларускай ССР ордэн Дружбы народаў.




*Сусветны дзень барацьбы з дыябетам. Праводзіцца з 1991 года Міжнароднай федэрацыяй дыябету пры ўдзеле Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў дзень нараджэння Фрэдэрыка Гранта Бантынга (1891—1941), канадскага фізіёлага, які адкрыў (сумесна з Дж. Дж. Маклеадам) гармон інсуліну.*

**1788** год — нарадзіўся Міхаіл Пятровіч Лазараў (1788—1851), рускі флатаводзец. Удзельнік руска-шведскай вайны 1808—1809 гадоў і вайны 1812 года. У 1813—1816 гадах ажыццявіў сваё першае кругасветнае плаванне з Кранштата да берагоў Аляскі і назад на караблі «Сувораў», адкрыў караллавыя астравы — атол Суворава ў Ціхім акіяне. У 1819—1821 гадах як камандзір шлюпа «Мірны» і памочнік начальніка кругасветнай экспедыцыі Ф. Ф. Белінсгаўзена ўдзельнічаў у адкрыцці Антарктыды і шматлікіх астравоў. У 1822—1825 гадах у якасці камандуючага фрэгатам «Крэйсер» ажыццявіў 3-е кругасветнае плаванне, падчас якога праведзены шырокія навуковыя даследаванні па метэаралогіі, акіянаграфіі, этнаграфіі і інш.



**1948** год — нарадзіўся Чарльз, прынц Уэльскі, наследны прынц Вялікабрытаніі (Віндзорская дынастыя), старэйшы сын Каралевы Лізаветы II і прынца Філіпа, герцага Эдынбургскага.

## УСМІХНЕМСЯ

**— А калі мужыкі хутчэй бегаюць: калі бягуць за бутэлькай ці калі бягуць за жанчынай?**

**— Калі бягуць з бутэлькай ад жанчыны!**

Жонка прараба нараджае на два-тры месяцы пазней за ўстаноўлены тэрмін.

**— Мама, наш тата кнігу напісаў. Я чуў, як ён па тэлефоне казаў: «Усё, наш раман скончаны».**

Пячоначная памяць — гэта калі п'еш безалкагольнае піва, але ўсё роўна злёгку п'янееш.





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4166.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 13 лістапада 2018 года.